

ХТО ПАЕДЗЕ НА «ЕЎРАБАЧАННЕ»? **9**

20 СЛАВУТАСЦЯЎ АДРАЗУ Ў АДНЫМ МЕСЦЫ **11**




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

6 ЛЮТАГА 2019 г. СЕРАДА № 24 (28891)


**ЛІЧБА ДНЯ**

**47,9 %**

*склала ўдзельная вага плацяжоў арганізацый недзяржаўнага сектара эканомікі ў фарміраванні даходаў бюджэту ў 2018 годзе. Гэта на 0,5 працэнтнага пункта больш, чым у 2017 годзе, паведаміла прэс-служба Міністэрства па падатках і зборах. За 2018 год падатковыя органы забяспечылі паступленне даходаў у бюджэт краіны ў памеры Br24,825 млрд (гэта складае 100,8 % планавых назначэнняў кансалідаванага бюджэту), у тым ліку ў рэспубліканскі бюджэт — Br10,7373 млрд (100,7 %), у мясцовыя бюджэты —Br14,0878 млрд (100,9 %). Звыш плана ў бюджэт паступіла Br195,2 млн. Тэмп росту даходаў кансалідаванага бюджэту склаў 99,5 % да ўзроўню 2017 года, у тым ліку рэспубліканскага бюджэту — 103,3 %.*




# ЛЕТАПІС АДНОЙ ВЁСКІ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Не кожны горад і, тым больш, не кожная вёска могуць пахваліцца кнігай пра сваю гісторыю, радаводы, цікавых людзей і іх лёсы. А невялікай вёсачцы Замошша Чашніцкага раёна з яе адзінаццаццю жыхарамі ў гэтым пашанцавала: у населенага пункта з'явіўся свой летапіс у выглядзе кнігі-альманаха. Нядаўна непасрэдна ў вёсцы адбылася прэзентацыя кнігі «Замошша. Гісторыя вёскі і ваколіц», сведкам якой стала і «Звязда».**

І хоць кніга пра Замошша не стала экспанатам кніжнай выстаўкі-кірмашу, якая адкрываецца сёння ў Мінску, яе з'яўленне на кніжным небасхіле стала знакавым для многіх людзей, чые карані паходзяць з замашанскай зямлі, а таксама красамоўным прыкладам таго, як можна любіць сваю малую радзіму і захаваць аб ёй добрую памяць.

**СТАР. 13**

**КОРАТКА**

**• Узносы страхавых арганізацый у краіне па прамым страхаванні і сустрахаванні ў 2018 годзе склалі Br1 млрд 203,3 мільёна і выраслі ў параўнанні з 2017 годам на 12,4 %.**

• У 2018 годзе ў Беларусі зарэгістравана больш за 60,7 тыс. шлюбаў, з іх ва ўрачыстай абстаноўцы — больш за 37,2 тыс. (61 %).



**• У Мінску і Віцебску ўчора паступілі паведамленні аб мініраванні офісаў «Белавія». На месцы выязджалі брыгады сапёраў, паведамленні не пацвердзіліся. Устанаўліваюцца асобы лжэмінёраў, заведзена крымінальная справа.**

ISSN 1990 - 763X

Размова па сутнасці

Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ:

## «КНІГІ — ГЭТА ХАРАКТАР ЖЫЦЦЯ Ў РОЗНЫХ ЯГО ПРАЯВАХ»



Фота Кастуся ДРОБАВА.

**Міністр інфармацыі аб сэнсе дэвізу кніжнай выстаўкі, аб чытацкіх перавагах, мастацкай паліграфіі і някрызісе жанраў**

**Сёння ў сталіцы адкрываецца ўжо традыцыйны ў культурна-асветніцкім жыцці краіны форум — XXVI Мінская міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш. Мерапрыемства, прыцягальнае і для выдаўцоў, і для пісьменнікаў, і для чытачоў. Аб тэндэнцыях у выдавецкай галіне, аб попыце і прапановах на кніжным рынку, аб грамадскім значэнні пісьменніцкага дыялогу мы напярэдадні адкрыцця пагутарылі з міністрам інфармацыі Аляксандрам КАРЛЮКЕВІЧАМ.**

**СТАР. 4**

## Не стой пад стралой!

### Чым небяспечныя вежавыя краны?




**Калі перафразаваць вядомую прымаўку, то ў многіх праблем ёсць тры абавязковыя характарыстыкі: прозвішча, імя і імя па бацьку. Славуты чалавечы фактар, аднак, можа прывесці і да лятальнага канца. Прыкладам таму — сітуацыя з пад'ёмнымі механізмамі. Летась пры рабоце на кранах у Беларусі адбылося 17 няшчасных выпадкаў. На вялікі жаль, два з іх скончыліся лятальна. Падрабязней пра гэта расказаў начальнік упраўлення нагляду за бяспекай пад'ёмных збудаванняў і атракцыёнаў Пётр КЛІМКО.**

— Большасць няшчасных выпадкаў, аварый і інцыдэнтаў, якія звязаны з выкарыстаннем грузапад'ёмных кранаў, мае арганізацыйны характар, — кажа суразмоўнік. — Напрыклад, да кіравання і абслугоўвання кранаў у якасці кранаўшчыкоў і стропальшчыкаў допускаюцца асобы без належнай кваліфікацыі. Калі ж з прафесійнай падрыхтоўкай усё добра, то не заўжды ажыццяўляецца патрэбны кантроль за тым, як выконваюцца рабочыя інструкцыі і тэхналагічныя рэгламенты. Стропальшчыкі парушаюць схемы работы і выкарыстоўваюць для аперацый няспраўныя прыстасаванні. Чым гэта заканчваецца — разбяром на канкрэтных прыкладах.

**СТАР. 5**

# НЕ ЗДОЛЕЎ — НЕ ПРАСІ

**Мноства эканамічных тэм — ад падтрымкі прадпрыемстваў да міжнароднага супрацоўніцтва — абмеркавалі ўчора на нарадзе ў Прэзідэнта.**

«Як мы з вамі дамаўляліся, сёння традыцыйна — нарада з эканамічным блокам нашай дзяржавы, ядром якога з'яўляецца ўрад. Паколькі пытанні, вынесеныя на нараду, датычацца і парламента, і Камітэта дзяржкантролю, Адміністрацыі Прэзідэнта, іншых структур, мы запрасілі сюды кіраўнікоў (названых органаў. — **«Зв.»**)», — адзначыў беларускі лідар.

Ён звярнуў увагу: на гэтай нарадзе на разгляд вынесена некалькі законапраектаў, якія непасрэдна будуць уплываць на дзелавую структуру і асяроддзе. Яны датычацца і міжнароднага супрацоўніцтва, узаемадзеяння з Еўрапейскім банкам рэканструкцыі і развіцця, мытных працэдур.

«Урад унёс прапановы па павышэнні эфектыўнасці работы асобных прадпрыемстваў. Пры гэтым яшчэ раз хачу нагадаць: ніякіх паслабленняў быць не павінна. І хопіць мне ўносіць прапановы па дзесяць разоў па тых прадпрыемствах, якія раней не выканалі абяцанае, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Толькі пасля таго, як, прабачце мне — чарговы раз нагадваю, кіраўнікі пойдуць у месцы вельмі далёкія, тады мы будзем разглядаць прапановы другі і трэці раз. А так кіраўніцтва прадпрыемстваў сябе выдатна адчувае, правалілі абяцанае, не вярнулі канкрэтна грошы ў бюджэт ці інвестару. А бюджэт павінен за іх цяпер плаціць і адказваць па іх даўгах. Трэба гэтую практыку было скончыць учора».

## Рэцэпт поспеху — своечасовасць і адказнасць

Па выніках нарады першы намеснік прэм'ер-міністра Аляксандр Турчын падзяліўся з журналістамі падрабязнасцямі сустрэчы.

Паводле яго слоў, адзін з блокаў разгледжаных пытанняў — гэта аспекты паляпшэння дзелавога клімату ў Беларусі, інвестыцыйнай прывабнасці. «Мы зрабілі акцэнт ужо на практыку прымянення пэўных нормаў заканадаўства ў нашай краіне. Таму неабходна будзе ўнесці пэўныя карэкціроўкі ў прапанаваныя дакументы. Канцэптуальна тыя асноўныя рэчы, якія ў іх выкладзены, кіраўніком дзяржавы падтрыманы», — адзначыў Аляксандр Турчын.

У найбліжэйшы час па гэтай тэме з'явяцца канкрэтныя дакументы.

Асобны блок пытанняў нарады датычыўся функцыянавання шэрагу беларускіх прадпрыемстваў — у прыватнасці «Гомельшкла». На думку першага віцэ-прэм'ера, урад можа з задавальненнем адзначыць, што дзяржаўная падтрымка гэтага прадпрыемства дала пэўныя вынікі. «Узровень рэнтабельнасці ў 2018 годзе дазваляе быць упэўненымі, што прадпрыемства ўсе свае абавязацельствы перад дзяржавай, бюджэтам, банкаўскай сістэмай выканае ў поўным аб'ёме», — сказаў Аляксандр Турчын.

На нарадзе абмяркоўвалі таксама цэментную прамысловасць, у якой, па словах Турчына, «сітуацыя больш сур'ёзная». Так, рэалізацыя інвестыцыйных праектаў прыйшлася на той час, калі значна знізіліся кошты на гэтую прадукцыю. «Але сёння як мінімум прадпрыемствы забяспечваюць сваю бягучую дзейнасць, а пытанні, скажам так, магчымага — падкрэсліваю, магчымага — аказання дзяржаўнай падтрымкі прадпрыемствам цэментнай галіны, я думаю, будуць прапанаваны Прэзідэнту ў асобным нарматыўна-прававым акце», — дадаў ён.

Па гэтай тэме кіраўнік дзяржавы паставіў жорсткія патрабаванні — у першую чаргу па тэрмінах пагашэння запазычанасцяў. Беларускі лідар запатрабаваў ад Камітэта дзяржкантролю і Адміністрацыі Прэзідэнта кантраляваць гэта пытанне. Іншы акцэнт Аляксандра Лукашэнкі — адказнасць кіраўніка прадпрыемства.

На нарадзе абмяркоўваўся і шэраг міжнародных дагавораў. «Пытанні датычыліся мытнага супрацоўніцтва ў рамках СНД, супрацоўніцтва з міжнароднымі фінансавымі структурамі, у прыватнасці з Еўрапейскім банкам рэканструкцыі і развіцця па фінансаванні пэўных праектаў у сферы жыллёва-камунальнай гаспадаркі», — расказаў першы намеснік прэм'ер-міністра.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

## Парламенцкі дзённік

# 20 КАПЕЕК ЗА БУТЭЛЬКУ

### Дэпазітная сістэма запрацуе з 2020 года

**Яе магчымасці разгледзелі падчас круглага стала ў ніжняй палаце парламента. Дэпутаты разам з прадстаўнікамі міністэрстваў, вытворчасці, гандлю абмеркавалі перспектывы на найбліжэйшыя гады, а таксама даведаліся пра літоўскі вопыт укаранення падобнай сістэмы.**



Кантэйнерная сістэма, якая зараз працуе ў нас, дазваляе збіраць толькі 40 — 60 % матэрыялаў на другасную перапрацоўку. У той жа час дэпазітная павышае ўзровень да 80 — 95 %. **Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы Таццяна КАНАНЧУК** каментуе, што пластык — велізарная экалагічная пагроза для планеты. Дэпазітная (залогавая) сістэма дазваляе памяншаць колькасць адходаў. Гэта, у сваю чаргу, памяншае негатыўнае ўздзеянне на навакольнае асяроддзе, на здароўе чалавека. «Дзякуючы дэпазітнай (залогавай) сістэме другасная сыравіна даволі высокай якасці. Яна ўжо адсартаваная, чыстая. Тое, што трапляе ў нашы кантэйнеры, потым праходзіць сарціроўку, і сыравіна мае вельмі нізкія характарыстыкі якасці. Для вытворцаў, якія выкарыстоўваюць гэту сыравіну, ад якасці залежыць канкурэнтаздольнасць прадукцыі».

Плануецца, што дэпазіт у 20 капеек будзе накладацца на шкляную, ПЭТ і алюмініевую ўпакоўку аб'ёмам ад 100 мілілітраў да трох літраў. Сюды не ўваходзяць бутэлькі з-пад малочнай прадукцыі і лякарстваў.

Сістэма будзе працаваць па двух кірунках. Па-першае, у крамах паставяць тараматы. Такія аўтаматы даюць магчымасць атрымаць ці наўпрост грошы за тару, ці зніжку на адпаведную суму на наступную пакупку. Другі варыянт — здаць бутэлькі ў пункты прыёму, якія захаваюцца.

На думку Таццяны Кананчук, варта адмаўляцца ад пластыка, а дакладней ад «той упаковачнай тары, якая не падлягае перапрацоўцы. Гэта практычна ўвесь аднаразовы посуд, кубачкі з-пад смятаны і гэтак далей. Адмаўляцца трэба паступова, бо гэта ўсё ідзе ў смецце. Перапрацоўцы такое не падлягае. А 300 гадоў і болей раскладання пластыку ў зямлі — гэта не аднаму будучаму пакаленню мы наносім шкоду».

**Начальнік упраўлення па кардынацыі дзейнасці ў сферы абарачэння з другаснымі матэрыяльнымі рэсурсамі дзяржаўнай установы «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў» Анатоль ШАГУН** растлумачыў, што для пакупнікоў на цэнніку будзе асобна вылучаны памер дэпазіту. Па разліках, увядзенне сістэмы нямоцна паўплывае на індэкс спажывецкіх цэн: з улікам залогу ён павялічыцца на 0,14 %, а без уліку — на 0,04 %. Таксама эксперт звярнуў увагу на бонусы: «Сістэма не патрабуе ад нас бюджэтнага фінансавання. Яна мінімум у два разы павялічыць аб'ём збору тары і скароціць на 10 % аб'ём захавання ДМР (другасных матэрыяльных рэсурсаў. — **«Зв.»**). Яна скароціць затраты на сарціроўку, на інвестыцыі і ў тым ліку знізіць плацяжы насельніцтва за паслугу з абарачэннем ЦБА. Плюс яна дазволіць стварыць каля 1500 рабочых месцаў. У асноўным у гандлі ў месцах прыёму. І гэта сістэма дазволіць павялічыць прыкладна на 0,1 % ВУП».

Пры гэтым Анатоль Шагун дадае, што такая сістэма — крок да шматабаротнай упакоўкі, якая з'яўляецца больш карысцю з пункту гледжання экалогіі.

**Надзея АНІСОВІЧ.**

## Наша пазіцыя

# Магчыма і трэба захаваць

**Выхад з Дагавора аб ліквідацыі ракет сярэдняй і меншай далёкасці (ДРСМД) можа прывесці да развалу сістэмы міжнародных пагадненняў у галіне бяспекі, раззбраення і кантролю над узбраеннямі.**

З такой заявай выступіў намеснік начальніка ўпраўлення інфармацыі і лічбавай дыпламатыі МЗС Беларусі Андрэй Шупляк, агучыўшы пазіцыю нашага знешнепалітычнага ведамства.

«На нашу думку, сітуацыя, якая складваецца сёння вакол ДРСМД, тоіць у сабе эскалацыю канфліктнага патэнцыялу і новы віток гонкі ўзбраенняў, што будзе мець сур'ёзныя доўгатэрміновыя наступствы для еўрапейскага кантынента. Перакананыя, што ў рамках прафесійнага і ўзаемапаважлівага дыялогу зацікаўленых бакоў, у першую чаргу ў рамках прадугледжаных ДРСМД механізмаў, магчыма і трэба захаваць Дагавор», — адзначыў дыпламат.

ЗША 2 лютага афіцыйна апавясцілі Беларусь аб выхадзе праз шэсць месяцаў з Дагавора аб ліквідацыі ракет сярэдняй і меншай далёкасці. Па словах Андрэя Шупляка, «Рэспубліку Беларусь, як адказнага ўдзельніка гэтага Дагавора, не можа не турбаваць яго будучыня». Беларускае МЗС заклікае ЗША і Расію праявіць «высокую адказнасць за лёс свету, як гэта зрабілі СССР і ЗША 30 гадоў таму, для таго каб апярэдзіць дэстабілізуючае ўздзеянне гэтага тыпу ўзбраенняў на бяспеку ў Еўразійскім рэгіёне».

Нагадаем, у мінулую пятніцу прэзідэнт ЗША Дональд Трамп заявіў, што Вашынгтон з 2 лютага пачынае працэдуру выхаду з ДРСМД. Уладзімір Пуцін на наступны дзень паведаміў, што Расія адпаведна адказа на гэта рашэнне і таксама прыпыняе ўдзел у Дагаворы.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Упершыню ў гісторыі Папа Рымскі наведаў Аравійскі паўвостраў і заклікаў «раззброіць сэрцы»



Папа Рымскі Францыск выступіў перад 700 прадстаўнікамі розных рэлігій і падпісаў сумесную заяву з вярхоўным імамам.

У ходзе гістарычнага візіту ў ААЭ Францыск заклікаў пакласці канец ваенным канфліктам. «Вайна не стварае нічога, акрамя галечы, зброя — нічога, акрамя смерці», — заявіў ён, выступаючы на міжрэлігійнай сустрэчы ў Абу-Дабі, у якой удзельнічалі каля 700 высокапастаўленых прадстаўнікоў розных рэлігій, у тым ліку ісламу, усходнехрысціянскіх цэркваў і іўдаізму. «Катастрафічныя наступствы» войнаў відавочныя, у прыватнасці ў Емене, Сірыі, Іраку і Лівіі, падкрэсліў кіраўнік Рымска-каталіцкай царквы.

«Гонка ўзбраенняў, пашырэнне сфер уплыву і агрэсіўная палітыка на шкоду іншым ніколі не прынясуць стабільнасці», — адзначыў пантыфік. Паводле яго слоў, прадстаўнікі розных рэлігій павінны разам выступаць «супраць логікі ўзброенай сілы, супраць манетызацыі адносін, нарошчвання ваеннага патэнцыялу на граніцах, узвядзення сцен, прыгнету бедных». Адначасова Папа Рымскі рашуча раскрытыкаваў рэлігійны гвалт, які «цяжкім чынам апаганьвае імя Бога» і «злоўжывае ім для апраўдання нянавісці і гвалту ў дачыненні да братоў». «Няма гвалту, які можна апраўдаць рэлігіяй», — падкрэсліў ён.

### Экс-супрацоўнік Белага дома заявіў аб адсутнасці шанцаў на захаванне ДРСМД

Надзей і шанцаў на захаванне расійска-амерыканскага Дагавора аб ліквідацыі ракет сярэдняй і меншай далёкасці (ДРСМД) не засталося. Такое меркаванне выказаў у гутарцы з карэспандэнтам ТАСС былы каардынатар Белага дома па пытаннях кантролю над узбраеннямі і нераспаўсюджваннем зброі масавага знішчэння Гэры Сеймар.

Пры гэтым ён сцвярджаў, што Масква і Вашынгтон фактычна ў роўнай ступені адказныя за цяперашняе развіццё падзей вакол ДРСМД. «Думаю, адміністрацыя Дональда Трампа засталася б у ДРСМД, калі б Расія знішчыла ракеты, якія парушаюць гэты дагавор. Аднак Масква не прызнаецца ў тым, што парушае дагавор, і не пойдзе на знішчэнне гэтых ракет, так што дагавор мёртвы», — лічыць Сеймар.

### На Гаваях хочуць забараніць продаж цыгарэт асобам, маладзейшым за 100 гадоў

Законапраект аб увядзенні забароны на продаж цыгарэт асобам, маладзейшым за сто гадоў, вынесены на разгляд заканадаўчага сходу штата Гаваі. Пра гэта паведаміў тэлеканал CNN.

Паводле яго даных, распрацоўшчыкам ініцыятывы з'яўляецца рэспубліканец Рычард Крыган. У законапраекце сказана, што Гаваі «пакутуюць ад залежнасці ад цыгарэт», бо «дзяржава атрымлівае велізарныя грошы дзякуючы падаткам на продаж тытунёвых вырабаў».

«Цыгарэта лічыцца самым смяротным артэфактам у гісторыі чалавецтва», — адзначаецца ў законапраекце.

Па даных CNN, забарону плануецца ўвесці да 2024 года ў некалькі этапаў, паступова павялічваючы мінімальны ўзрост. Гэтыя абмежаванні не будуць распаўсюджвацца на электронныя цыгарэты, цыгары і жавальны тытунь, адзначае тэлеканал.

На дадзены момант продаж цыгарэт на Гаваях забаронены асобам, маладзейшым за 21 год.

Напярэдадні падзеі

# НА ЛЫЖНЮ ПА ЗДАРОЎЕ І АКТЫЎНАСЦЬ

## 9 лютага на лыжаролернай трасе ў мікраараёне «Вяснянка» адбудзецца зімовае спартыўнае свята «Мінская лыжня»

**Плануецца, што ўдзел у ім прыме больш за 3 тысячы чалавек. Гэта будзе не толькі лыжная гонка, як раней, а яшчэ і біятлонная. Першы старт запланаваны на 11.00, у гэты час пачнецца біятлонная эстафетная гонка 4 па 3,6 км сярод камандаў Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Савета Міністраў, аблвыканкамаў, Мінскага гарвыканкама, Вярхоўнага Суда, Канстытуцыйнага Суда, Нацыянальнага алімпійскага камітэта і камандаў аматараў.**



Далей адбудзецца біятлонная гонка з масавым стартам сярод жанчын на прызы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. На лыжню выйдуць і каманды вышэйшых навучальных устаноў (з ліку студэнтаў), а завершаць вялікае спартыўнае свята масавыя старты ў лыжных гонках на 2,5 км.

*«Зіма ў нас асацыюецца з некалькімі відамі спорту. Гэта хакей, біятлон, фрыстайл, лыжныя гонкі. Але найбольш папулярны, вядома ж, біятлон. Таму было прынята рашэнне акцэнты зрабіць на гэты від спорту. Плюс яшчэ масавасць: чым больш людзей будзе займацца, тым больш спартсменаў у нас на нашай пірамідзе павінна быць. «Мінская лыжня» — ужо традыцыйнае свята. Яно праводзіцца з году ў год. І трэба ўнесці нейкую цікавінку, нешта новае. Сёлета будзе цудоўнае свята»,* — адзначыў **міністр спорту і турызму Сяргей КАВАЛЬЧУК.**

Пераможцы і прызёры ў эстафетах вызначаюцца па найменшым часе, затрачаным на праходжанне дыстанцыі чатырма ўдзельнікамі. Яны будуць узнагароджаны медалямі, прызамі, каманды-пераможцы і прызёры — кубкамі. А ўсе ўдзельнікі, якія прыйшлі да фінішу, атрымаюць памятныя медалі.

Падчас спаборніцтваў будзе арганізаваны выязны гандаль, у тым ліку адкрыюцца пункты гарачага харчавання. Балельшчыкаў, якія жадаюць падтрымаць сваіх сяброў і блізкіх на трасе, чакае культурна-забаўляльная праграма, прадугледжана некалькі актыўных зон.

У сувязі з правядзеннем свята ў перыяд з 9.00 да 17.30 будзе павялічана колькасць рухомага саставу на аўтобусных маршрутах № 1 і № 133, арганізавана работа часовага тралейбуснага маршрута № 10Д «ДС Вяснянка — ст. м. Пушкінская».

Адзначым, што ўпершыню «Мінская лыжня» прайшла 16 лютага 1986 года, калі быў арганізаваны лыжны прабег на 15 км па маршруце Баравая — Раўбічы ўздоўж аўтамабільнай трасы Мінск — Віцебск. У ім узялі ўдзел 12 тысяч аматараў гэтага віду спорту. З 2003 года па ініцыятыве Міністэрства спорту і турызму з'явілася рэспубліканскае спартыўнае свята «Беларуская лыжня». Ініцыятыва прыжылася, і па прыкладзе сталіцы падобныя старты праходзяць зараз і ў іншых рэгіёнах Беларусі.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

Паехалі!

# ЗАРАДКА — НЕ ПРАБЛЕМА. АЛЕ ЗА ГРОШЫ

## Сёлета ў Беларусі плануецца значна пашырыць сетку ЭЗС

**Летась у рамках уласнай праграмы вытворчае аб'яднанне «Беларуснафта» пабудавала 65 электразарадных станцый (ЭЗС), з іх 35 — Mode3 і 30 — Mode4, паведамілі ў канцэрне «Белнафтахім».**



Цяпер агульная колькасць ЭЗС аб'яднання складае 80 адзінак, што дазваляе забяспечыць электрамабілям з сярэднім прабегам у 150 кіламетраў бесперашкодны праезд па тэрыторыі краіны. ЭЗС размешчаны на АЗС, на стаянках бізнес-цэнтраў, офісных будынкаў, жылых кварталаў, паблізу гісторыка-культурных і спартыўных аб'ектаў, паблізу буйных гандлёвых цэнтраў, а таксама на асноўных аўтадарогах краіны, у абласных гарадах і раённых цэнтрах. Сёлета «Беларуснафта» мяркуе значна пашырыць «электрычную» сетку — будзе ўведзена ў эксплуатацыю яшчэ 160 ЭЗС. Для параўнання: у гэтым годзе плануецца будаўніцтва васьмі і рэканструкцыя 16 аўтазаправачных станцый.

Як паведаміў neft.by **інжынер групы перспектыўнага развіцця новых энергетычных тэхналогій кампаніі «Беларуснафта» Максім СУСАРЭНКА,** кампанія мае намер пачынаючы з 2022 года ўстанавіць 20 суперхуткіх зарадных комплексаў. Сумарная магутнасць кожнага з іх складзе ад 2 МВт, а ўстаноўленая магутнасць адной станцыі — 475 кВт. Цяпер акумулятары ў электракарах змяняюцца вельмі хутка, адзначыў спецыяліст «Беларуснафты». Напрыклад, калі Nissan Leaf, BMW i3 Ford Focus Electric першапачаткова прапаноўвалі рэальны запас ходу каля 130—160 кіламетраў, то ў іншых сістэмах гэтых мадэляў ён павялічыўся да 200—250 км. А да 2024 года запас ходу ў сярэднім складзе каля 350—400 кіламетраў.

Як вядома, «Беларуснафта» з 2014 года аказвае паслугу па зарадцы электрамабільнага транспарту на бязвыплатнай аснове. Як паведаміў Максім Сусарэнка, у ІІ квартале плануецца зрабіць паслугу платнай. Цана будзе ў межах 0,3 беларускага рубля за 1 кВт/г. Пры такім тарыфе кошт 100 кіламетраў шляху пры расходзе ў 18 кВт складзе каля 5 рублёў 40 капеек. Як заўважыў Максім Сусарэнка, гэта амаль у 2,3 раза танней, чым кошт прабегу аналагічнай адлегласці на аўтамабілі з рухавіком унутранага згарання. Пры сярэднім расходзе ў 8 літраў на 100 кіламетраў атрымліваецца 12 рублёў 20 капеек.

**Ул. інф.**

Чулі?

# Вяртлявую чаротаўку экспартуюць у Літву

## Беларускія навукоўцы аднаўляюць папуляцыю гэтай птушкі ў гістарычных месцах жыхарства

**Вяртлявая чаротаўка да сярэдзіны XX стагоддзя знікла з тэрыторыі многіх краін Заходняй Еўропы. Гэты від занесены ў Чырвоную кнігу са статусам уразлівы. Як паведаміў старшы навуковы супрацоўнік Навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па біярэсурсах Міхаіл МАКСІМЕНКАЎ, самая вялікая папуляцыя вяртлявай чаротаўкі гняздуецца ў нашай краіне — 38 %, ва Украіне — 33 %, Польшчы — 27 %, а ў Літве ўсяго толькі 1 % ад усёй папуляцыі.**

Каб аднавіць папуляцыю балотных спевакоў, распачата рэалізацыя сумеснага беларуска-літоўскага праекта «Стварэнне сеткі ключавых месцапражыванняў для забеспячэння доўгатэрміновага спрыяльнага ахоўнага статусу вяртлявай чаротаўкі ў Літве». Рабочая назва праекта — LIFE Magni Ducftus Acrola — «Вялікае кнства вяртлявай чаротаўкі».

Летась паспяхова праведзена адно з ключавых мерапрыемстваў праекта — транслакацыя вяртлявай чаротаўкі з тэрыторыі беларускага балота Званец у літоўскі біясферны рэзерват «Жувінтас». Адлоў птушак ажыццяўляўся з сярэдзіны мая да пачатку чэрвеня. Маладыя птушаняты ўтрымліваліся на тэрыторыі заказніка «Званец» да таго часу, пакуль прывыклі да жыцця ў абмежаванай прасторы. На экспарт прызначалася 50 птушанят, усе яны былі акальцаваныя. Навукоўцы атрымалі неабходныя дакументы для бесперашкоднага перасячэння дзяржаўнай граніцы з такімі незвычайнымі спадарожнікамі і перавезлі птушанят у «Жувінтас». У Літве пасля адаптацыі птушак выпусцілі ў прыроду.

Сёлета ў чэрвені будзе ажыццёўлены другі этап транслакацыі вяртлявай чаротаўкі.

**Аксана ЯНОЎСКАЯ.**

Нашы правы

# Больш за 1 млрд рублёў

## Такая сума даўгоў вернута летась з дапамогай Мінюста

**Перавод адміністрацыйных працэдур «аднаго акна» ў электронны фармат і стварэнне шматфункцыянальных цэнтраў па аказанні паслуг. Падпісанне дагавораў аб узаемнай дапамозе па грамадзянскіх, эканамічных і крымінальных справах з Кувейтам, Індыяй і Ганконгам і змены ў закон аб дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці. Пра гэтыя і іншыя планы Міністэрства юстыцыі Беларусі, якое сёлета адзначае 100-годдзе, расказаў міністр Алег СЛІЖЭЎСКІ.**

Адзін з асноўных момантаў работы ў 2018-м — прыняцце закона «Аб нарматыўных прававых актах», які ўступіў у сілу 1 лютага 2019-га. Гэты дакумент, у прыватнасці, рэгламентуе парадак публічнага абмеркавання праектаў нарматыўных прававых актаў, ажыццяўленне прававога маніторынгу (ацэнкі якасці заканадаўства і практыкі яго правапрымянення), а таксама прагназаванне наступстваў прыняцця нарматыўных актаў.

— Органам, якія былі ініцыятарамі прыняцця дакументаў, неабходна ў далейшым маніторыць, як нормы працуюць на практыцы. А да гэтага, яшчэ на стадыі распрацоўкі, — прааналізаваць магчымыя наступствы дзеяння нормаў, каб разумець, дзеля чаго мяняецца заканадаўства і ці трэба прымаць той ці іншы дакумент, — абазначыў Алег Сліжэўскі.

Ён таксама падвёў вынікі пяцігадовай дзейнасці органаў прымусовага выканання:

— Створаная сістэма выконвае ўскладзеныя на яе задачы. Калі ў 2013 годзе было 53,8 % дакументаў, выкананых у поўным аб'ёме (у тым ліку і па месцы працы даўжніка), то ўжо летась іх было 81,3 %.

Пры гэтым амаль удвая паменшылася колькасць спраў, якія вярталіся спагнанніку ў сувязі з немагчымасцю выканання, і ў некалькі разоў узрасла сума вернутых грошай: 300 мільёнаў рублёў у 2013-м і 1,1 мільярда рублёў — летась. У АРІП у мінулым годзе створаны сэрвіс, дзякуючы якому можна аплаціць запазычанасць па выканаўчым дзеянні. А рэестр запазычанасцяў пры Мінюсце штомесяц апрацоўвае больш за 35 мільёнаў запытаў.

Сярод меркаваных сёлета змен міністр назваў поўны пераход да электроннага выканаўчага вядзення і аўтаматызацыю інфармацыйнага абмену паміж усімі бакамі гэтага працэсу. А таксама заканадаўчую забарону супрацоўнікам аднаго і таго ж рыэлтарскага агенцтва адначасова прадстаўляць і пакупніка, і прадаўца.

**Ірына СІДАРОК.**

Факт

# У ЭЛЕКТРОННАЙ ФОРМЕ ЗАРЭГІСТРАВАЛАСЯ ТЫСЯЧА ЗАМЕЖНІКАЎ

**Сёння кожны дзясяты іншаземец, які прыбыў у Беларусь у 2019 годзе і які звярнуўся па рэгістрацыю, ажыццявіў яе бясплатна ў электроннай форме на адзіным партале электронных паслуг portal.gov.by, якая пачала функцыянаваць з 2 студзеня гэтага года, нагадалі ў МУС.**

Найбольш актыўнымі карыстальнікамі адміністрацыйнай працэдуры ў электроннай форме сталі прадстаўнікі Ізраіля, Германіі, ЗША, Італіі, Турцыі, Польшчы, Кітая, Грузіі, Францыі, Вялікабрытаніі і Іспаніі. Пры гэтым тысячным замежнікам стаў грамадзянін Турцыі, які прыбыў днямі праз Нацыянальны аэрапорт Мінск.

Рэгістрацыя замежнікаў у электроннай форме ажыццяўляецца бясплатна і без наведвання падраздзялення па грамадзянстве і міграцыі, таму спецыялісты прагназуюць у далейшым рост колькасці такіх рэгістрацый, асабліва ў перыяд правядзення ІІ Еўрапейскіх гульняў.

Работа рэсурсу арганізавана такім чынам, што сістэма звяраецца з некаторымі базамі дадзеных, якія змяшчаюць звесткі пра замежнікаў, і супастаўляе атрыманую інфармацыю. Калі хоць адзін знак у прозвішчы ці імені, пашпартных даных будзе ўведзены няправільна або няправільна пазначана дата перасячэння мяжы, незапоўнены або некарэктна запоўнены неабходныя палі, у рэгістрацыі будзе адмоўлена. Абсалютная большасць адмоў адбылася якраз па прычыне няправільнага запаўнення рэквізітаў заявы.

Замежніку неабавязкова мець пры сабе пацвярджэнне электроннай рэгістрацыі. Дастаткова паведаміць пра гэта, напрыклад, супрацоўніку органа памежнай службы пры выездзе з краіны. Не лішнім будзе захаваць скрыншот адказу аб паспяховай рэгістрацыі ці раздрукаваць укладыш аб рэгістрацыі — гэта паскорыць працэдуру праверкі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# «КНІГІ — ГЭТА ХАРАКТАР ЖЫЦЦЯ...»

*(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)*

**— Аляксандр Мікалаевіч, дэвіз сёлетняй кніжнай выстаўкі: «Больш, чым кнігі». Ці не прызнанне гэта таго, што друкаваныя кнігі сыходзяць з інфармацыйна-адукацыйнага поля нашага грамадства, што, каб прыцягнуць увагу чытача, трэба штосьці большае?**

— Не, усё ж такі іншы сэнс укладваецца ў гэты дэвіз. Кнігі — гэта характар жыцця ў розных яго праявах. Сацыяльнага, актыўнага жыцця. Кнігі — гэта не толькі хатняя бібліятэка вакол цябе, паліцы якой забіраюць прастору жыцця. Наадварот — кнігі пашыраюць прастору жыцця. Яны паблізу кожнага з нас. Яны дазваляюць нам шырока крочыць па свеце, насычаюць нас планамі і задумкамі. Дазваляюць летуценнасць, жаданні і мары зрабіць часткай рэальнага жыцця. Кнігі вучаць. Кнігі насычаюць ведамі. Кнігі дазваляюць думаць шырока, кнігі робяць жыццё нашмат багацейшым...

**— Ведаю многіх людзей, якія ў пачатку лютага імкнуцца трапіць на выстаўку, каб набыць штосьці новае і цікавае для сваёй бібліятэкі. Асаблівай папулярнасцю карыстаюцца кнігі для дзяцей. Наколькі вядома, паводле рэйтынгаў продажаў «Белкнігі» за мінулы год, лідарам стаў «Дзіцячы атлас Беларусі». Атрымліваецца, не прайграе ў наш час той кнігавыдавец, які робіць стаўку на дзіцячыя кнігі?**

— Так, гэта відаць і па статыстыцы айчыннага кнігавыдання. Паболела, на шчасце, кніг для падлеткаў, якія ўжо чытаюць самі, а не толькі прыгожа ілюстраваных выданняў для немаўлят, маленькіх чытачоў, якім і набываюць кніжкі, і чытаюць іх бацькі. Іншая справа, што важна правільна выбраць менавіта патрэбную кнігу для юнага чытача. Тут шмат залежыць ад бібліятэкараў, настаўнікаў, псіхолагаў чытання, метадыстаў чытання. Мы яшчэ вельмі мала часу выдаткоўваем на тое, каб прарэкламаваць дзіцячую кнігу, каб даказаць яе вартасці. Лічаныя выданні вядуць кніжныя калонкі. І зусім лічаныя выданні прапагандуюць дзіцячую кнігу. Затое ў праграме выстаўкі — і ў Адміністрацыйным будынку па Пераможцаў, 14, і ў бібліятэках, кнігарнях горада вельмі шмат розных імпрэз, аўтограф-сесій, звязаных з дзіцячай кнігай. Над гэтым працуюць выдаўцы, над гэтым працуюць самі аўтары. І патрыярх беларускай дзіцячай літаратуры Уладзімір Ліпскі, і Анатоль Зэкаў, Мікола Чарняўскі, Алена Стэльмах, Яна Явіч, Генадзь Аўласенка, Міхась Пазнякоў — усе яны і шмат хто яшчэ ідуць да дзіцячага чытача, да іх бацькоў. Звярніце ўвагу на праграму выстаўкі, яна размешчана на сайце Міністэрства інфармацыі — і вы знойдзеце дзясяткі цікавых мерапрыемстваў, дзясяткі цікавых адрасоў, а галоўнае — у выніку адкрыеце для сябе новыя дзіцячыя кнігі, магчыма — нешта набудзеце.

**— Увогуле, мне здаецца, што друкаваная кніга сябе не зжыве, могуць зжыць сябе толькі пэўныя жанры, напрыклад, раман. Людзі сёння хочуць чытаць, але каб хутчэй, няшмат і з карцінкамі... Вы пагодзіцеся ці паспрачаецеся?**

— Пра жанры не буду спрачацца: для гэтага трэба быць вялікім тэарэтыкам. Хачу сказаць, мяркуючы не толькі па беларускай нацыянальнай літаратуры: існуюць, працягваюць сваё жыццё і традыцыйныя, добра вядомыя жанры, якія сцвердзілі сябе ў мінулым і пазамінулым і ранейшых стагоддзях. Вы перажываеце за знікненне рамана, а ён якраз зараз знаходзіцца на асаблівай вышыні. Для прыкладу хацеў бы прывесці раман «Зулейха адкрывае вочы» Гузель Яхінай. Татарская пісьменніца, якая піша па-руску. Яшчэ два гады назад яе дэбютны (!) раман быў перакладзены ўжо на 16 моў. Раман, які вяртае нас да падзей сталінскіх часоў. Здавалася б, шмат, усё ўжо сказалі пра іх. Але гэта якраз той выпадак, калі спрацоўвае вымярэнне не «Што сказаць», а «Як сказаць...» Вось і захапіла Гузель Яхіна ў цянёты, у свой тэкст, зрабіла расповед надзіва сучасным, па-мастацку рэльефным. І разам са сваімі памкненнямі сказаць праўду, калі хочаце, нават «рэабілітавала» жанр рамана. А следам мы ўжо не можам не прачытаць наступны яе раман — «Дзеці мае». Прыход Гузель Яхінай да шырокага чытача ва ўсім свеце — гэта падзея, роўная прыходу Льва Талстога...

**— Ні больш ні менш..?**

— Так. Думаю, што не толькі мой прыватны чытацкі густ так высока ўзводзіць пісьменніцкі талент Гузель Яхінай.

**— А ў беларускай літаратуры традыцыі знікаюць..?**

— Нікуды яны не знікаюць. І верлібр,следаванне многіх паэтаў «беламу вершу» — гэта не знікненне, а развіццё, спалучэнне традыцый і наватарства... Максім Танк — паэт, які прыняў на сябе ўвесь боль і драматызм ХХ стагоддзя, за сваё творчае жыццё паспрабаваў (і годна! дастойна!) сябе ў розных «фарматах» — і ў класічным вершы, і ў свабодных, вольных формах. А што да прозы, то і яна сёння з кнігамі Андрэя Федарэнкі, Алены Брава, Уладзіміра Сцяпана, Уладзіміра Саламахі, Альгерда Бахарэвіча, Алеся Бадака, Людмілы Рублеўскай, а цяпер і Андрэя ці Андруся Горвата нікуды не знікае, а развіваецца, прыцягвае да сябе мноства чытачоў.

**— Калі казаць пра выдаўцоў, Мінская міжнародная выстаўка-кірмаш, якая праводзіцца ўжо 26-ы раз, стала прызнанай пляцоўкай для абмену вопытам. Вы амаль увесь час яе правядзення мелі да яе самае непасрэднае дачыненне. Па вашых назіраннях, чаму вучацца нашы выдаўцы ў гасцей, а чаму — госці ў нашых выдаўцоў?**

— Вучацца ці павінны вучыцца ўсе, безумоўна, адзін у аднаго. Найперш — паліграфічнаму выкананню кнігі. Дызайн, графічнае афармленне, папера, малюнкі, шрыфты — усё гэта не дробязі. І не ўлічваць іх кнігавыдаўцы, кніжныя графікі не маюць права.

**— Сёлета традыцыйна будуць падводзіцца вынікі конкурсу «Мастацтва кнігі». Ці можна сказаць, што гэтым разам была відавочная канкурэнцыя паміж выданнямі?**

— І не меней шырокая, чым у ранейшыя гады. Але ж агучванне вынікаў конкурсу яшчэ наперадзе, таму не буду называць нават прэтэндэнтаў на перамогу. Як на мой погляд, журы працавала на ўзроўні, меркаванні ў ацэнках выказваліся прафесійныя. Заўважу, што ў нашай краіне па-ранейшаму захоўваецца піетэт да знешняга выгляду кнігі, да ролі кніжнага дызайну, афармлення ў кнігавыдавецкай справе. Адпаведна і ёсць прафесіяналы, здольныя даць вартыя ацэнкі, прывесці аргументы, якія б уплывалі на гэтыя ацэнкі. Конкурс «Мастацтва кнігі» — шматгадовы і вельмі творчы праект. Вельмі шмат намаганняў да яго правядзення прыкладае ветэран кніжнай справы Валерый Рагалевіч. Мы яму і яго калегам па рабоце ў журы «Мастацтва кнігі» вельмі ўдзячны.

**— Вынікі яшчэ аднаго конкурсу запланаваны на выстаўцы — на найлепшы кнігагандлёвы аб'ект. Але крытэрый, паводле якога ацэньваліся прэтэндэнты на перамогу, — інтэрактыўнае галасаванне — паказчык досыць суб'ектыўны...**

— Але ж хоць і суб'ектыўны — разам з тым менавіта такі, які дазваляе ўсім выказацца. Заадно і паказчык таго, хто заходзіць у кнігарню.

**— Міжнародны сімпозіум «Пісьменнік і час» — таксама традыцыйнае мерапрыемства на выстаўцы. Аб чым пойдзе гаворка сёлета?**

— Да ўдзелу ў сімпозіуме прычыніліся болей дваццаці краін свету. Прыедуць паэты, празаікі, публіцысты, перакладчыкі, літаратуразнаўцы з розных старонак. Найперш я хацеў бы назваць тых сяброў беларускай літаратуры, якія па-за межамі нашай краіны прапагандуюць беларускае мастацкае слова, спрыяюць знаёмству з ім сваіх суайчыннікаў. З Ташкента прыедзе перакладчыца Рысалат Хайдарава. Дзякуючы ёй ствараецца трывалы мост у развіцці беларуска-ўзбекскіх літаратурных сувязяў. З Душанбэ разам з калегамі-кнігавыдаўцамі прыязджае Ато Хамдам, які ў апошняе дзесяцігоддзе шмат зрабіў для прадстаўлення беларускай літаратуры ў Таджыкістане. Вялікая дэлегацыя пісьменнікаў чакаецца з Алматы. На чале гэтай дэлегацыі — наш добры сябра літаратуразнаўца Святлана Ананьева. І ў беларускім, і ў казахстанскім друку яна актыўна выступае з артыкуламі пра сучасную беларускую літаратуру. Шмат гасцей прыедзе з Расійскай Федэрацыі: галоўны рэдактар часопіса «Роман-газета» Юрый Казлоў, дырэктар выдавецтва «Художественная литература» празаік Георгій Прахін, першы намеснік галоўнага рэдактара часопіса «Наш современник» публіцыст і літаратурны крытык Аляксандр Казінцаў, маладая пісьменніца Алена Тулушава, народны паэт Татарстана Рэнат Харыс, народны паэт Чувашыі Валеры Тургай... Дарэчы, і на выстаўцы Расійская Федэрацыя са сваімі кнігамі, выдавецтвамі — у цэнтры ўвагі. Расія як краіна з'яўляецца Цэнтральным экспанентам XXVI Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу.

Канешне ж, пісьменнікі будуць весці рэй, звязаны з лёсам мастацкага слова, мастацкай літаратуры, культуры, з іх уплывамі на развіццё грамадства, на лёс нашых краін і народаў. Пляцоўка сімпозіума «Пісьменнік і час» — гэта дадатак у тым велізарным складніку палітыкі міралюбства і добрасуседства, якія сцвярджае кіраўніцтва нашай краіны, які сцвярджае ў сваёй штодзённай палітыцы Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка.

**— Сёлета да правядзення выстаўкі, дакладней, да прыцягнення ўвагі да кнігі далучыліся іншыя ўстановы. Напрыклад, Купалаўскі музей, які прапануе інтэрактыўную экспазіцыю, Усіхсвяцкі храм, дзе будзе арганізавана дыскусійная пляцоўка аб ролі кнігі ў фарміраванні духоўнага развіцця грамадства, а таксама арганізавана тэматычная выстаўка і прэзентацыі новых кніг, і нават сталічныя кафэ і рэстараны, дзе пройдзе гастратыдзень, у час якога ў меню ўключаць стравы, апісаныя ў кнігах беларускіх пісьменнікаў... Але ці не адцягне гэта ўвагу людзей ад самой выстаўкі?**

— А якая розніца, дзе чытач, наведвальнік знойдзе патрэбную яму кнігу, дзе ён будзе знаходзіцца пад уражаннем сустрэчы з пісьменнікам?! Што да Купалаўскага музея, то там пройдзе адмысловая вечарына «Янка Купала і Уолт Уітмен». А «Мастацкая літаратура» наўмысна да выстаўкі падрыхтавала выданне Уолта Уітмена «Лісце травы» на беларускай мове. Дарэчы, трэцяе выданне кнігі «Лісце травы», пачынаючы з 1978 года. Унікальны выпадак для перакладной кнігі! Але ж і паэт вялікі!.. У Нацыянальным гістарычным музеі пройдзе выстаўка беларуская экслібрыса. Пэўна, за апошнія гады першы раз на такім узроўні прэзентуецца беларускі кніжны знак. У Палацы мастацтва — выстаўка кніжнай графікі... І такіх прыкладаў досыць шмат. Галоўнае — шчырая ўвага да кнігі, да кніжніцтва. А якая розніца — на якіх пляцоўках і ў якіх фарматах...

**Пытанні задавала Алена ЛЯЎКОВІЧ.**




# ПОГЛЯД ПРАЗ АБ'ЕКТЫЎ



**Падведзены вынікі фотаконкурсу «Мой родны кут», які праводзіўся рэдакцыяй газеты «СБ. Беларусь сегодня». Больш за тры тысячы фотаздымкаў было даслана чытачамі на адрас рэдакцыі. Першы намеснік міністра інфармацыі Павел Лёгкі, які з'явіўся старшынёй журы, адзначыў, што выбраць найлепшыя работы было даволі складана, бо кожны фотаздымак — гэта цэлая гісторыя.**

— Праглядаючы здымкі, я кіраваўся пачуццямі, якія выклікала тая ці іншая работа. Бо кожны з лаўрэатаў надзелены высокім дарам бачыць падзеі больш глыбока, чым гэта дадзена звычайнаму чалавеку. Але, нягледзячы на складанасць, праца ў журы была адначасова і вельмі прыемнай. Дзякуй удзельнікам конкурсу за тыя эмоцыі, якія яны нам усім падарылі.

І вось наступіў момант назваць найлепшых. У намінацыі «Землякі» першае месца ў Аляксея Ганчука за работу «У чаканні аўтакрамы», другое — у Аксаны Спрынчан за здымак «Верніца», і трэцяе месца заняла работа «Шчаслівая лужына» Міхаіла Капычкі. У намінацыі «Мая малая радзіма» найлепшымі былі абраны наступныя фотаздымкі. Першае месца ў Святланы Альшэўскай за работу «Жнівеньская нарада», другое — у Сяргея Шлягі за здымак «Акенца ў восень», і трэцяе месца ў Жанны Дзянішчык за фотаработу «Царква ў вёсцы Сынкавічы».

А Гран-пры конкурсу і галоўны прыз — ноўтбук — атрымала Наталля Дораш, аўтарка такіх цікавых фотаработ, як «Рыжы хлопец», «Царква ў сяле Чарлёна», «Анюта».

**Андрэй САЗОНАЎ. Фота аўтара.**

На ўсе 100!

# А ЦІСК АМАЛЬ ЯК У КАСМАНАЎТА

**Найстарэйшай жыхарцы прыгранічнага з Расіяй Суража, былога райцэнтра (цяпер — у Віцебскім раёне), у дзень свята Вадохрышча споўніўся век. Цікава, што бабуля працавала трактарысткай.**
**Таццяна Сідараўна Волкава дэталёва расказвае пра работу, вайну, сваякоў. На здароўе не скардзіцца. У прыватнасці, падчас чарговага агляду здзівіла медработнікаў ціскам 130 на 80. Ды і таблеткі ж не ўжывае! За ўсё жыццё толькі адну аперацыю зрабілі — апендыцыт выразалі!**



Дарэчы, на Віцебшчыне пражывае 62 чалавекі ва ўзросце 100 і больш гадоў. Сярод іх сем мужчын. Пра гэта паведамілі «Звяздзе» ў Камітэце па працы, занятасці і сацыяльнай абароне аблвыканкама.

Нечаканым сюрпрызам для аўтара гэтых радкоў стала інфармацыя пра тое, што доўгажыхарку з глыбінкі можнаназваць сваячкай. Яе сын, які, на жаль, памёр, быў жанаты з жанчынай, якая з'яўляецца свекрывёю маёй стрыечнай сястры.

Павіншаваць юбілярку праз некалькі дзён пасля дня нараджэння мы накіраваліся, як той казаў, цэлай дэлегацыяй на чале з кіраўніком сельвыканкама Аляксандрам Вялітчанкам.

Усяго ў Суражы насельніцтва каля 950 чалавек. Гарадскі пасёлак, як у песні Юрыя Антонава, падзяляе рака. Там, дзе жыве пенсіянерка, прыблізна 90 суражцаў. Гэтую частку населенага пункта тутэйшыя называюць Задзвінне. Калі накіроўваліся туды, прайшліся і па замёрзлай Заходняй Дзвіне. (Мароз у гэты дзень быў каля мінус 20.) Справа ўбачылі паром, пра які «Звязда» шмат разоў пісала. Як і пра катар з ганарлівай назвай «Тытанік». Па дарозе кіраўнік мясцовай улады заінтрыгаваў тым, што суседка імянінніцы трохі не дажыла таксама да векавога юбілею. (А быў бы насамрэч унікальны выпадак: дзве жанчыны жывуць побач і абедзве ва ўзросце за 100 гадоў.)

І вось ён акуратны дом з калодзежам ва двары. Ва ўтульным пакоі за сталом юбілярка. Побач завіхаецца дачка Зоя Міхайлаўна. Жыве яна аж у Камсамольску-на-Амуры. Цяпер дачка — пенсіянерка, працавала на будоўлях. У яе ёсць брат-блізня, тэлемайстар у Полацку...

Расіянка часта наведвае маму, жыве з ёй месяцамі. Калі ж няма такой магчымасці, дачку замяняе сацыяльны работнік.

Прызнаюся, спачатку падумаў, што Зоя Міхайлаўна будзе «перакладчыкам», бо з людзьмі ў вельмі паважаным узросце складана гутарыць. Але бабуля здзівіла тым, што добра разумела пытанні і распавядала пра ўсё, чым цікавіліся суразмоўцы, агучваючы і нюансы.

Яна нарадзілася ў Горацкім раёне Магілёўшчыны. 7 класаў скончыла. Працавала ў саўгасе — на полі, коней пасвіла. Пасля курсаў механізатараў стала трактарысткай. Ездзіла на жалезным кані Харкаўскага трактарнага завода. Калі пачалася вайна, механізаваную трактарную станцыю, дзе працавала, перавезлі ў Горкаўскую вобласць.

Бабуля расказала, як праходзіла эвакуацыя, як два нямецкія самалёты ляталі над чыгункай. Падчас чарговага налёту ёй нехта крыкнуў, каб легла на зямлю і па-пластунску перасоўвалася. Але гэтага яна не ўмела рабіць, устала ды і пайшла. Магчыма, такім чынам захавала жыццё.



Калі Віцебск яшчэ не вызвалілі, жанчына вярнулася на свабодную ад акупантаў зямлю. Зноў жа працавала на трактары. Між іншым, яе будучы муж таксама быў трактарыстам. Яна нарадзіла яму чатырох дзяцей. У юбіляркі шасцёра ўнукаў і тры праўнукі.

Адказала і на мае пытанні пра даўгалецце. Ніхто з яе блізкіх сваякоў не пражыў такое доўгае жыццё. Харчавалася, як і ўсе. І цяпер можа выпіць чарачку-другую. Яшчэ пару гадоў таму з задавальненнем працавала ў агародзе, хадзіла ў лазню. З людзьмі ніколі старалася не сварыцца, ліха нікому не жадала, незайздрослівая. Напэўна, у гэтым яе «сакрэты».

Бабуля вельмі рада была таму, што прыйшлі яе павіншаваць і самадзейныя артысты. Гучаў гармонік і народныя песні. Прыемны падарунак зрабіў народны жаночы клуб «Залатыя ўзрост» Мазалаўскага сельскага дома культуры.

Дарэчы, пенсіянерка і сама добра спявае і словы не блытае. Любіць жартаваць, расказваць анекдоты.

Бабуля не адстае ад часу. Напрыклад, аднойчы спытала ў дачкі, што такое інтэрнэт, бо пра гэта перыядычна кажуць па тэлевізары. Цяпер вырашыла, што будзе вучыцца карыстацца скайпам, каб гутарыць са сваякамі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# Не стой пад стралой!



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Напярэдадні мінулага Дня Незалежнасці а чацвёртай гадзіне дня ў пятніцу, 29 чэрвеня, драма разыгралася ў вёсцы Копішча, што знаходзіцца зусім побач з мяжой Мінска. Зараз там масава ўзводзяцца высотныя жылыя дамы. На адной з чарговых будоўляў манціраваўся вежавы кран. Але ў нейкі момант работы пайшлі не па інструкцыі. Грузавы канат падхапіў і скінуў уніз датчык вугла ўздыму стралы крана. Апарат гэты даволі важкі: яго маса дасягае сямі кілаграмаў. І паляцеў ён уніз з вышыні 36 метраў. Калі ўявіць сабе гэту вышыню, то да такой адзнакі дацягвае ецца 12-павярховы дом. Прызямліўся датчык акурат на мантажніка будаўнічых машын і механізмаў. Шанцаў выжыць у небаракі не засталося.

Другая трагедыя здарылася праз паўтара месяца ў Свіслацкім раёне. Спецыялісты раённага прадпрыемства ЖКГ адправіліся ў гарадскі пасёлак Поразава для таго, каб на тэрыторыі мясцовага саўгаса замяніць у свідравіне глыбінную помпу. Аўтамабільны кран падняў наверх трубу, і слесары пачалі ставіць фіксавальны хамут для таго, каб пасля разабраць злучэнне труб. І вось у нейкі момант з верху ўзнятай трубы сарваўся агаловак і ўпаў проста на слесара, які ў гэты час ставіў хамут. Чалавек загінуў на месцы.

А вось наступны выпадак інакш, як вялікім шанцаваннем, і не назавеш. Пачатак мінулага красавіка выдаўся даволі ветраным. І вось у адну ноч на ніжнім грузавым прычале ў Мазыры парыў ветру сарваў і перакуліў грузапад'ёмны партальны кран. Тэхніка атрымала вельмі істотныя пашкоджанні. Дзякуючы таму што на гадзінніку было 00.20, абышлося без пацярпелых. Разбор гэтага здарэння выявіў цэлы шэраг парушэнняў. Мала таго што кран не быў замацаваны належным чынам проціўгоннымі тармазамі, дык яшчэ і два тармазы механізма перасоўвання былі няспраўныя. А двух іншых не было ўвогуле. Пуць пад кранам таксама не вытрымліваў ніякай крытыкі.

Куды менш аптымістычна скончылася гісторыя ў Мінску. У канцы красавіка цяжкую траўму атрымаў арматуршчык аднаго з таварыстваў з абмежаванай адказнасцю. Без якога-небудзь узгаднення з выканаўцам работы ён пералез цераз сігнальную агароджу і зайшоў у небяспечную зону работы вежавага крана для таго, каб забраць падрыхтаваную раней арматуру, якая стаяла на бетоннай пліце каля новабудоўлі. Машыніст крана ў гэты час падаваў уцяпляльнік на 14-ы паверх. Адна з галін стропа зачапілася за паддон з уцяплялльнікам, які і зваліўся якраз на арматуршчыка.

Да цяжкіх наступстваў прывёў цэлы букет парушэнняў у Магілёве. Падчас рэканструкцыі цеплавой сеткі стралавы самаходны кран перамяшчаў шчыт апалубкі. Страпоўку груза рабіў чалавек, які не меў адпаведнай кваліфікацыі. Самі стропы таксама былі няспраўныя — там адсутнічалі замкі на круках. Крук з грузам лагічна расчапіўся і ўпаў на мантажніка тэхналагічнага абсталявання, які ў гэты час знаходзіўся ў небяспечнай зоне. І гэта яшчэ не ўсё. Экспертыза крана, якая праводзілася пасля здарэння, высветліла, што гэты агрэгат мала таго што быў у няспраўным стане, але яшчэ і яго эксплуатацыю забаранілі годам раней з-за таго, што ён не прайшоў тэхнічны агляд.

— Прычыны практычна кожнага надзвычайнага здарэння з грузапад'ёмнымі кранамі звязаныя з няправільнымі дзеяннямі стропальшчыкаў і машыністаў кранаў, — адзначае Пётр Клімко. — Менавіта таму Дзяржпрамнагляд разаслаў у рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання, абласныя і Мінскі гарадскі выканкамы, а таксама ў арганізацыі, падпарадкаваныя ўраду, адмысловы ліст. Ад кіраўнікоў падведамасных арганізацый патрабуецца правесці пазапланавыя працоўныя інструктажы з машыністамі кранаў і стропальшчыкамі, а таксама забяспечыць вытворчы кантроль за выкананнем правілаў прамысловай бяспекі пры эксплуатацыі грузапад'ёмных кранаў. Вынікі гэтых мерапрыемстваў будуць разглядацца на адмысловых нарадах, у якіх пры неабходнасці прымуць удзел і прадстаўнікі Дзяржпрамнагляду. Як кажуць, збан носіць ваду да пары. І за кожным здарэннем, якое трапляе ў нашу зводку, стаіць чалавечае гора і матэрыяльныя страты. Хоць усяго толькі дастаткова выконваць тэхніку бяспекі.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

Здарэнні

## Пакараны за нашэнне міліцэйскай кашулі

**Ноччу ў міліцыю паступіла паведамленне ад відавочцаў пра тое, што ва ўстанове па вуліцы Лабанка ў Мінску невядомы мужчына, адзеты ў міліцэйскую кашулю, ужывае спіртныя напоі.**

Гэтыя грамадзянін быў затрыманы. Ім аказаўся 24-гадовы мінчанін, які працуе кіроўцам на адным са сталічных прадпрыемстваў па рамонце і тэхнічным абслугоўванні гандлёвага абсталявання, паведамілі ў Фрунзенскім РУУС г. Мінска. У дачыненні да мужчыны складзены адміністрацыйны пратакол, рашэннем суда Фрунзенскага раёна грамадзянін атрымаў пакаранне ў выглядзе штрафу і канфіскацыі прадмета адміністрацыйнага правапарушэння. Раней мінчанін прыцягваўся да адміністрацыйнай адказнасці за ўчыненне дробнага хуліганства, з'яўленне ў грамадскім месцы ў стане алкагольнага ап'янення, кіраванне транспартным сродкам у стане алкагольнага ап'янення, а таксама за здзяйсненне мноства іншых правапарушэнняў па лініі Дзяржаўтаінспекцыі.

## Зняў са спячай жанчыны ланцужок

**У Першамайскае РУУС г. Мінска паступіла заява ад жанчыны, у якой скралі залатыя ланцужок з кулонам.**

Міліцыянеры хутка ўстанавілі асобу злачынцы, ён быў затрыманы. Ім аказаўся 33-гадовы непрацуючы жыхар Віцебскай вобласці, які ў апошні час пражываў у сталіцы. Мужчына раней прыцягваўся да крымінальнай адказнасці за крадзяжы. Высветлілася, што фігурант быў у гасцях у знаёмага, там жа знаходзілася і пацярпелая. Разам яны ўжывалі спіртныя напоі. Неўзабаве прадстаўніца прыгожага полу заснула, а зламыснік, скарыстаўшыся сітуацыяй, зняў з яе шыі залатыя ланцужок з кулонам. Крадзенае ўпрыгажэнне мужчына заклаў у ламбард, а за вырučаныя грошы купіў спіртныя напоі, паведамілі ў Першамайскім РУУС сталіцы.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

100 гадоў
Беларуская ССР

# Сцяпан Некрашэвіч.
# РУПЛІВЕЦ МОВЫ

## Ён арганізаваў у Адэсе трыццаць беларускіх школ, стаў аўтарам першага «Буквара» Савецкай Беларусі, ініцыятарам стварэння і першым кіраўніком Інбелкульта

**Настаўнік, салдат на перадавой Першай сусветнай, апантаны нацыянальнай ідэяй эсэр — ідэйны праціўнік бальшавікоў, супрацоўнік Наркамата асветы Савецкай Беларусі, ініцыятар і першы кіраўнік Інстытута беларускай культуры, віцэ-прэзідэнт Нацыянальнай акадэміі навук, дырэктар Інстытута мовазнаўства, ссыльны, пазбаўлены ўсіх званняў і рэгалій, асуджаны і расстраляны «вораг народа», рэабілітаваны і адноўлены на пасадзе акадэміка... Яго біяграфія так падобная на біяграфіі іншых герояў нашай рубрыкі. А вось гэта — менавіта пра яго, Сцяпана Некрашэвіча: апантаны філолаг, у многім дзякуючы якому беларуская мова з вуснай «мужыцкай» ператварылася ў мову народа асобнай рэспублікі — з правіламі, слоўнікамі, тэрміналогіяй...**



### НАСТАЎНІК ІДЗЕ НА ВАЙНУ

Сцяпан Міхайлавіч Некрашэвіч нарадзіўся ў красавіку 1883 года ў вёсцы Данілаўка тагачаснага Бабруйскага павета (цяпер Светлагорскі раён Гомельскай вобласці). У сваёй аўтабіяграфіі ён пісаў, што паходзіць з сялян, але сучасныя навукоўцы «раскапалі» яго шляхецкія карані. **Доктар гістарычных навук Эмануіл ІОФЕ** ў сваім артыкуле «Першы старшыня Інбелкульту» прыводзіць нават дакументы, якія сведчаць аб прыналежнасці да дваранства роднага дзядзькі Некрашэвіча Рыгора Фёдаравіча. Адпаведна, бацька нашага героя, Міхал Фёдаравіч, наўрад ці мог пісацца селянінам. Зрэшты, розніцы ў тым вялікай няма: шалёныя падзеі першых дзесяцігоддзяў XX стагоддзя перамяшалі і перамясцілі лёсы сотняў тысяч людзей незалежна ад іх сацыяльнай прыналежнасці.

Так было і з Некрашэвічам. Атрымаў трывалую настаўніцкую адукацыю — спачатку навучаўся дома ў «дарэктара», пасля ў настаўніцкай семінарыі ў Панявежысе, у Віленскім настаўніцкім інстытуце. Працаваў па спецыяльнасці — вучыў дзяцей. Так было б, пэўна, і надалей, але вайна, якая пачалася, унесла свае карэктывы: вясковага настаўніка мабілізавалі і накіравалі служыць на Румынскі фронт.

Рэвалюцыя — спачатку Лютаўская, заспела яго там, у акопах. Салдаты абралі адукаванага саслужыўца ў армейскі камітэт 6-й арміі. А з верасня 1917 года Некрашэвіч, як сам адзначаў у аўтабіяграфіі, быў «чыноўнікам вайсковага часу», але, дадзім, — з нацыянальным ухілам: ужо тады арганізаваў беларускую вайсковую канферэнцыю ў Адэсе.

Пасля кастрычніка 1917 года пад кіраўніцтвам Некрашэвіча (які на той час быў членам Беларускай Сацыялістычнай Грамады) утварыўся і дзейнічаў «Беларускі нацыянальны камісарыят у Адэсе». Логіка была зразумелая: у паўднёвым горадзе знаходзілася шмат беларускіх бежанцаў і салдат... У кастрычніку 1918 года «Дзянніца» паведамляла, што дзякуючы намаганням Некрашэвіча ў Адэсе на пачатку навучальнага года адкрыта «30 пачатковых беларускіх школ і беларуская змешаная гімназія ў складзе першых чатырох класаў».

У Адэсе ён вучыўся ў Вышэйшым міжнародным інстытуце, загадваў беларускай секцыяй пры губернскім аддзеле народнай асветы. Сказаць, што быў лаяльны да бальшавікоў у той час, нельга, хутчэй наадварот. Пасля распаду БСГ у 1918-м далучыўся да Беларускай партыі эсэраў, стаў адным з яе кіраўнікоў. Эмануіл Іофе прыводзіць яшчэ адзін цікавы неадназначны факт з тагачаснага перыяду жыцця Некрашэвіча: «13 студзеня 1919 года старшыня размешчанага ў Адэсе «Беларускага нацыянальнага цэнтру» Сцяпан Некрашэвіч звярнуўся да камандуючага войскамі Антанты на поўдні Расіі генерала Бэртэло з мемарандумам аб стварэнні Заходняй Беларускай арміі, якая мае мэтай барацьбу з бальшавікамі. Некрашэвіч абяцаў стварыць з бежанцаў, якія прыбылі з Беларусі, вайсковы кантынгент колькасцю да 40 тысяч чалавек. Але задума не ажыццявілася»...

### ПАЛІТЫК ПАДАЎСЯ Ў НАВУКУ

Дзіўныя былі часы. Ужо ў канцы 1920 года нядаўна перакананы эсэр Некрашэвіч, які хацеў сабраць армію супраць бальшавікоў, апынаецца на пасадзе ў Наркамаце асветы БССР, якой кіруюць бальшавікі. Як такое магло здарыцца? «Выпадак па тым часе быў хутчэй тыповы, — тлумачыць **кандыдат гістарычных навук, загадчык аддзела навейшай гісторыі Інстытута гісторыі НАН Сяргей ТРАЦЦЯК.** — Успомнім, што Жылуновіч прыйшоў з левага крыла «грамадоўцаў», Ігнатоўскі — з тых жа эсэраў. У той час бальшавікі яшчэ цярпіма ставіліся да іншадумцаў, а ў выпадку з беларускай рэспублікай адчуваўся востры недахоп менавіта нацыянальных кадраў».

Менавіта Некрашэвічу належыць ідэя стварэння даследчыцкай установы, якая будзе вывучаць культурныя каштоўнасці і здабыткі беларускага народа. У студзені 1921 года на сходзе, скліканым Наркамасветы, Сцяпан Некрашэвіч зачытаў даклад, у якім ён прапанаваў стварыць «адпаведную лабараторыю». «Гэтая ўстанова пры самай шырокай падтрымцы нашае сацыялістычнае ўлады павінна згуртаваць вакол сябе ўсе беларускія сілы, дзе б яны ні знаходзіліся, выкарыстаць іх па простаму іх прызначэнню і быць адказнай за культурную справу на Беларусі», — цытуе Эмануіл Іофе вытрымкі з гэтага даклада.

Інбелкульт стварылі толькі праз год, але ідэя Некрашэвіча пачала рэалізоўвацца ў выглядзе Навукова-тэрміналагічнай камісіі Наркамата асветы, задачай якой была распрацоўка беларускай навуковай тэрміналогіі розных сфер жыцця. У склад камісіі ўваходзілі гуманітарная, прыродазнаўчая і матэматычная секцыі. Сябрамі камісіі былі Янка Купала, Якуб Колас і, канешне, Сцяпан Некрашэвіч. За зусім кароткі час секцыі камісіі апрацавалі больш за дзве тысячы тэрмінаў.

У студзені 1922 года на базе Навукова-тэрміналагічнай камісіі быў заснаваны Інстытут беларускай культуры — першая шматгаліновая навукова-даследчыцкая ўстанова рэспублікі. Яе задачай было арганізаваць планамернае вывучэнне этнаграфіі, мовы, літаратуры, мастацтва, гісторыі, геаграфіі, прыроды, эканомікі, сацыяльна-грамадскага руху Беларусі, а таксама аб'ядноўваць і каардынаваць усю навукова-даследчыцкую работу ў БССР. Старшынёй інстытута прызначылі Сцяпана Міхайлавіча Некрашэвіча. Плёнам працы гэтай установы стала найперш выданне падручнікаў — у многіх дысцыплінах тут давялося пачынаць практычна з нуля.

### ЛІНГВІСТ МЯНЯЕ ПРАВАПІС

І ўсё ж галоўнай справай жыцця Сцяпана Некрашэвіча была беларуская мова, якой ён рупіўся надаць усе атрыбуты дзяржаўнай мовы самастойнай рэспублікі. Ці можна сёння сказаць, што Сцяпан Некрашэвіч быў пачынальнікам сучаснага беларускага мовазнаўства? «Гэта не зусім так, — адказвае **кандыдат філалагічных навук, дырэктар Інстытута мовазнаўства НАН Ігар КАПЫЛОЎ.** — Заснавальнікам, а тым самым і пачынальнікам сучаснага беларускага мовазнаўства з'яўляецца Яўхім Карскі, які ўпершыню апісаў сістэму беларускай мовы, паказаў яе сувязь з іншымі славянскімі мовамі і вызначыў яе нацыянальную спецыфіку. Заслуга Сцяпана Некрашэвіча ў тым, што ён працягнуў традыцыі Карскага і развіў іх на новым узроўні. Ён прымаў актыўны ўдзел у апрацоўцы беларускай навуковай тэрміналогіі па розных галінах ведаў, у падрыхтоўцы лексікаграфічных прац («Беларуска-расійскага слоўніка», «Расійска-беларускага слоўніка»), якія адыгралі надзвычай важную ролю ў станаўленні і нармалізацыі лексічнага складу беларускай літаратурнай мовы. Яму належыць канцэпцыя ўкладання слоўніка жывой беларускай мовы, які характарызаваўся ўсімі адзнакамі сапраўднага акадэмічнага лексікона (абгрунтаваў часавыя межы выдання, крыніцы адбору слоў, акрэсліў структуру слоўнікавага артыкула). Некрашэвіч стаяў ля вытокаў стварэння серыі рэгіянальных, ці краёвых, як тады іх называлі, слоўнікаў».

Слоўнік жывой беларускай мовы павінен быў стаць галоўным вынікам навуковай дзейнасці Сцяпана Некрашэвіча. Працуючы ў 1925—1926 гадах пад кіраўніцтвам Яўхіма Карскага ў Ленінградзе, куды яго накіравалі для павышэння лінгвістычнай кваліфікацыі, ён адначасова працаваў над гэтым праектам. Да збору лексічнага матэрыялу, дзякуючы заклiку Некрашэвіча на Першым з'ездзе краязнаўцаў, далучылася ўся рэспубліка: словы і выразы дасылалі студэнты, настаўнікі, вучні. Гэта магло б стаць фундаментальнай працай: было зафіксавана 382 047 слоў. Але да 1929 года ўдалося выдаць толькі некалькі дыялектных слоўнікаў, пасля праца была спынена, а ўсе напрацоўкі згарэлі ў полымі Вялікай Айчыннай...

Апекаваўся Сцяпан Некрашэвіч не толькі «акадэмічнымі» пытаннямі мовы, але і першапачатковай адукаванасцю беларусаў. Менавіта ён быў аўтарам першага паслярэвалюцыйнага «Лемантара», які ўпершыню выйшаў у свет у 1922 годзе і вытрымаў шэсць выданняў. Ён быў суаўтарам чытанкі для дзяцей «Роднае слова», дапаможніка для ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых «Наша сіла — ніва ды машына».

Нельга тут не згадаць і пра ролю навукоўца ў рэформе правапісу беларускай мовы, якая ўрэшце вылілася ў «наркамаўку». Размовы аб тым, што правапіс трэба спрашчаць, вяліся ў мовазнаўчых колах ужо ў сярэдзіне 20-х, і той жа Браніслаў Тарашкевіч прапанаваў адмовіцца ад мяккага знака пасля мяккіх зычных (пра гэта ў інтэрв'ю «Звяздзе» расказваў калісьці акадэмік Аляксандр Падлужны). А якую пазіцыю займаў Некрашэвіч? «На Акадэмічнай канферэнцыі па рэформе беларускага правапісу і азбукі, якая адбылася ў 1926 годзе, Некрашэвіч выступіў з судакладам па рэформе беларускага правапісу, у якім прапанаваў адхіліць праект правапісу братоў Лёсікаў і падтрымаць асноўныя правілы Браніслава Тарашкевіча, удакладніць і дапоўніць некаторыя з іх, — расказвае Ігар Капылоў. — Пастановы канферэнцыі 1926 года не былі ажыццёўлены. Таму ў 1927 годзе стварылі новую Арфаграфічную камісію на чале з Некрашэвічам, якая пасля двух гадоў працы ў 1929 годзе апублікавала праект правапіснай рэформы. Многія яго палажэнні былі пакладзены ў аснову праекта, на базе якога СНК БССР у 1933 годзе прыняў вядомую пастанову «Аб зменах і спрашчэнні беларускага правапісу»...

Пасля стварэння на базе Інбелкульта Нацыянальнай акадэміі навук Сцяпан Некрашэвіч стаў яе віцэ-прэзідэнтам і першым дырэктарам Інстытута мовазнаўства. «Ён зарэкамендаваў сябе як выдатны арганізатар навукі, які здолеў сабраць ва ўстанове таленавітых вучоных, якія фактычна сталі заснавальнікамі новых навуковых напрамкаў у беларускім мовазнаўстве», — гаворыць яго сённяшні спадкаемца.

### АКАДЭМІК СТАНОВІЦЦА «ВОРАГАМ НАРОДА»

20 кастрычніка 1929 года была апублікавана пастанова СНК БССР, якая прадпісвала «вызваліць акадэміка Ластоўскага Вацлава Усцінавіча ад абавязкаў Неадменнага Сакратара Беларускай Акадэміі навук і акадэміка Некрашэвіча Сцяпана Міхайлавіча ад абавязкаў Віцэ-Прэзідэнта Беларускай Акадэміі навук». Падстава была па тым часе «забойная»: «дапушчана надрукаванне ў выданнях Акадэміі навук шэрагу працаў паасобных аўтараў, якія праводзяць у гэтых працах погляды, зусім несумяшчальныя з палітыкай Савецкай улады, а часамі і погляды, варожыя Савецкай уладзе».

Былыя акадэмікі, яшчэ, напэўна, не ўсведамляючы, што проста так усё не скончыцца, улетку 1930-га накіраваліся ў экспедыцыю ў Томск, каб вывучаць мову і побыт беларусаў Сібіры. Там менавіта на параходзе «Тобольск» іх і арыштавалі — ва ўсю раскручвалася справа «Саюза вызвалення Беларусі», а як жа без такіх выдатных «фігурантаў»? Пасля амаль года зняволення ім нарэшце вынеслі прысуд. Некрашэвічу прысудзілі пяць гадоў высылкі ў горадзе Сарапул ва Удмурціі, дзе ён працаваў спачатку планавіком-эканамістам арцелі інвалідаў, а затым бухгалтарам збожжанарыхтоўчай канторы.

Ці трэба казаць, што жывым у 1937-м яго не пакінулі? Спачатку працягнулі ссылку на два гады, пасля судзілі па новай і ў снежні 1937 года расстралялі.

* * *

Рэабілітавалі Сцяпана Некрашэвіча па другім прысудзе ў 1957 годзе. Рэабілітацыі па прысудзе 1931-га давялося чакаць яшчэ больш за трыццаць гадоў. І ўжо па смерці — яшчэ адзін дзіўны факт яго біяграфіі: у званні акадэміка яго аднавілі ў 1978 годзе, калі пра рэпрэсіі і іх ахвяр увогуле гаварыць было не прынята. «Гэта адбылося пад уплывам акадэмічнай супольнасці, які быў падтрыманы аўтарытэтам Пятра Машэрава, — тлумачыць Сяргей Траццяк. — Напрацоўкі Некрашэвіча карысталіся заўсёды, таму для навукоўцаў было справай гонару вярнуць акадэміку яго незаслужана адабранае званне».

«Напрацоўкі Сцяпана Міхайлавіча Некрашэвіча актуальныя і сёння, — гаворыць Ігар Капылоў. — Гэта натуральна, таму што без пераемнасці не можа быць сур'ёзнай навукі. Пры выпрацоўцы стандартаў і ўстанаўленні норм у адносінах да тэрмінаў і сёння вучоныя-тэрмінолагі часта звяртаюцца да Навукова-тэрміналагічнай камісіі Інбелкульта. Тэарэтычныя асновы, распрацаваныя Некрашэвічам у галіне лексікаграфіі, цікавяць і сёння ўкладальнікаў перакладных і дыялектных слоўнікаў. Застаецца да сённяшняга дня нерэалізаванай ідэя Некрашэвіча аб стварэнні слоўніка жывой беларускай мовы, застаецца актуальнай канцэпцыя, прапанаваная вучоным».

Яго іменем сёння названая вуліца ў сталічным мікрараёне Брылевічы. Але найлепшым помнікам Некрашэвічу сапраўды стаў бы створаны навуковай і грамадскай супольнасцю слоўнік Жывой беларускай мовы. Пакуль яна яшчэ жывая.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**

Сам-насам... З усімі

# «З РАДЗІМАК ТЫХ СКЛАДАЕЦЦА РАДЗІМА,

## але радзімка ў кожнага — свая...»

**Здавалася б, што можа кропелька вады расказаць пра мора? Прыкладна тое ж, што адзін чалавек (прычым не Колас, не Караткевіч...) пра сваю малую радзіму.**

**Але ж часам кроплі зліваюцца. Асобныя расказы — таксама. І з'яўляецца новая карціна.**

ВЁСКА Табулкі, рачулка Ясельда... Там засталіся нашы першыя слядкі і слязы, — піша **спадарыня Ніна Бакун з вёскі Балічы Шчучынскага раёна** (гэтыя і іншыя лісты друкуюцца ў скарачэнні. — **Аўт.**), — там першыя радасці і турботы, там самыя добрыя, самыя светлыя ўспаміны — успаміны пра родную хату, ружовыя заранкі, водар сена і сырадою, якім паілі матулі, каб мы хутчэй раслі. Хіба ж такое забудзецца? Не, малая радзіма — гэта наша душа. Магічнай сілай яна прыцягвае да сябе, не дае спакою і будзіць думкі. Голас малой радзімы — гэта яшчэ і магілы бацькоў, якіх ужо няма, але яны заўсёды ёсць і будуць, пакуль ёсць мы і нашы дзеці.

Што праўда тое праўда. І па доказы нікуды хадзіць не трэба. «У 1966 годзе наша сям'я з дзесяці чалавек (васьмёра дзяцей) пераехала ў вёску Карніца Глускага раёна. І тады ж насупраць новай хаты, праз вуліцу, мама пасадзіла грушу, — піша **спадар Валерый Васілеўскі з г. п. Глуск.** — З часам пад ёй з'явіліся лаўка, столік. Дрэўца расло, а разам з ім і мы, дзеці, а потым ужо і ўнукі...

Сёння бацькоўская хата, на жаль, пустуе, але кожны год — не толькі на Радаўніцу — пад мамінай ігрушай (на здымку) збіраюцца і будуць збірацца іх шматлікія нашчадкі...

Кажуць, кожны кулік, — працягвае аўтар, — хваліць сваё балота. Хваліў бы і я ў меру ўласных сіл, аднак зараз, у мінулым часе трэба гаварыць і пра добрых, працавітых людзей, і пра некалі грыбныя ды ягадныя лясы, і пра багатыя ўраджаі. А для чалавека няма, відаць, большай журы, чым бачыць вось гэты заняпад сваіх родных мясцін і ведаць, што ты нічога не можаш паправіць. Нашы бацькі, якія жылі і працавалі тут, гадавалі дзяцей, на вялікі жаль, адправілі іх у вялікі свет, не пакінуўшы сабе замены, і таму вёска памірае. А некалі ж...

Варта заплюшчыць вочы і на балаціне паміж вёсак Карніца і Турыно адразу ўбачыш рознакаляровы дыван з важнымі бусламі, пачуеш салаўіныя спевы, якія несліся, здаецца, з кожнага куста!

Пасля меліярацыі тут назаўсёды зніклі крыніцы, а следам і ўсё, што жылокрасавала. На калгасныя палі сталі вывозіць верхні пласт торфу, разам з ім «рассейваць» пустазелле, потым знішчаць яго рознымі ядахімікатамі, і тым самым атручваць зямлю. Вось і думай, навошта нам быў гэты «стэп», перарэзаны пустымі канавамі? І ці варта было за нейкія дадатковыя цэнтнеры збожжа губіць так званыя лёгкія планеты, губіць прыгажосць.

Толькі праз паўстагоддзя тая спустошаная балаціна стала пакрысе ажываць, — працягвае **спадар Васілеўскі.** — Вось толькі ці ёсць каму гэтым цешыцца? Калгасныя палеткі месцамі зарастаюць хмызняком і травой — дарогі. Не стала нават той, па якой у апошні шлях везлі землякоў на іх могілкі ў вёску Вольніца, нябожчыкаў цяпер вязуць па кругавой, праз Глуск... А тым часам апошнія жыхары Карніц тройчы на тыдзень сустракаюць рэйсавы аўтобус з надзеяй убачыць на прыпынку кагосьці са сваіх.

НЕВЯСЁЛАЕ відовішча, якое дапаўняе **спадар Іван Астроўскі з Мінска**:

Пабываў на радзіме
я трохі,
Паглядзеў
на павалены плот.
Зараслі там травою
дарогі,
Скрозь — баршчэўнік,
хмызняк ды асот.
Ну а хаткі?..
А хаткі згарэлі.
Галавешкі ў крапіве
гніюць,
Пагнілі, паржавелі
арэлі...
Хто народзіць тут?..
Тут не жывуць!
...Можа, некалі й з'явіцца
хтосьці,
Ды, падобна,
не наш беларус.
На зямлі сваёй
мы ўжо як госці,
Бо свайго адракліся
чамусь...

Дзякаваць Богу не ўсе. Але ж аб гэтым трошкі пазней, пакуль вельмі коратка — аб прычынах. І зноў жа — радком вершаваным ад **спадара Міколы Грабянька з аграгарадка Радзюкі, што на Шаркаўшчыне**:

Калі бываю
ў нейчай хаце
І там жаночы голас чую,
Я ўспамінаю
сваю маці —
Прыгожую і маладую.
На золку печ яна паліла:
Сям'я, карова,
«свінства», хата...
Работы шмат
перарабіла,
Як на адну,
дык мнагавата...

Не дзіва, што дочкам-сынкам хацелася іншай долі, іншага жыцця — лягчэйшага гарадскога. І яны сапраўды з'язджалі туды, каб нарэшце...

Не ведаю, як хто, а я нарадзіўшыся і амаль усё жыццё пражыўшы ў вёсцы, — піша **спадарыня Ніна Бурко з Бярэзіншчыны**, — ніколі не стамлюся слухаць трэлі высокіх жаўрукоў, посвісты салаўёў у прыбярэжных кустах і нават сумнае «ку-ку». Люблю гудзенне трактароў, цвіценне лёну, водар хлеба, які ідзе ад спелай збажыны, люблю вёску, вуліцы якой нібы абдымаюць раку. Некалі яна была шырокай і паўнаводнай, па ёй на прыстань у Беразіно сплаўлялі лес, працаваў млын. І жыхароў было шмат, сем'і, у асноўным, шматдзетныя. Але ж гэта, як спяваецца ў песні, было нядаўна і было — даўно. Паступова стала пусцець наша вёска, страшна было глядзець на забітыя дошкамі вокны і дзверы...

Праўда, апошнім часам сітуацыя змянілася. У вёсцы няма больш пустуючых хат. Нейкія з іх гараджане скупілі пад дачы, а ў многія, пасталеўшы ды паразумнеўшы, з гарадоў вярнуліся дзеці. Прыкладам таму мой сусед Віктар Фёдаравіч Фясун. Яго жонка Марыя Дзмітрыеўна ўсё жыццё працавала ў сталічнай краме «Рыга», а як толькі выйшла на заслужаны адпачынак, пераехала ў пустуючы бацькоўскі дом. Муж падаўся следам, хоць яму да пенсіі заставалася гадоў сем ці восем... Але ж майстар-сантэхнік і ў вёсцы не застаўся без працы. Яго клікалі ажно ў тры месцы. Гэта я кажу тым, хто баіцца, што прападзе — не знойдзе работы...

Цяпер Віктар ужо на пенсіі, але па-ранейшаму працуе, і яго дом, на якім красуецца «шыльда» ўзорнага, служыць любімым прыстанкам для пяцярых дзяцей і пяцярых унукаў. Летам усе Фесуны шчыруюць на прысядзібным участку, яны ж першыя ў зборы грыбоў і ягад.

Незразумелым для многіх з'явілася вяртанне з Мінска і двух братоў Архіпцоў, — піша **спадарыня Бурко.** — Абодва яны — сямейныя, абодва прадпрымальнікі і людзі не бедныя. Маглі б, здавалася, адпачываць недзе ў цёплых краінах, але яны выбралі свой родны кут, свае Капланцы. Адзін з братоў усім на зайздрасць зрабіў бацькоўскую сялібу, другі — дзядулеву.

Ажывілі роднае гняздо, упрыгожылі яго сваёй прысутнасцю Людміла і Уладзімір Калолы. Дом абшылі модным цяпер сайдынгам, падворак ператварылі ў царства кветак і птушак...

І гэта яшчэ не ўсё. Першае, за што прыйшлося ўзяцца на радзіме Мікалаю Андрэевічу Шалаю, дык гэта высекчы алешнік, які заглушаў пад'езд да дома. Дроў у выніку назапасіў на тры зімы! Усе пабудовы — лазню, летнюю кухню, дах дома — пафарбаваў, усё, што трэба было — абшалёваў. Зрабіў прыгожай не толькі сваю сялібу, але і месца навокал.

А вось Віталій Уладзіміравіч Папруга аграсядзібу на радзіме адкрыў — з невялікім рыбным вадаёмам, пляжам, саўнай. Едуць людзі!

І ўсё ж найболей, — піша шаноўная **Ніна Мацвеёўна**, — мяне здзіўляе наш Генадзь Уладзіміравіч Анцыпаў. Ён — кандыдат навук, у Мінску хадзіў у немаленькіх начальніках, а цяпер... Не перастаю здзіўляцца яго шматлікім талентам. Ён і пчаляр, і будаўнік, і агароднік, і рыбак... На ўсё гэта не хапала часу ў маладыя гады, затое зараз...

Вось таму я і думаю, што не зарастуць бацькоўскія сцежкі травою бяспамяцтва, будзе жыць вёска, хоць, можа, і не тым жыццём, што раней».



ПРА яго, новае, яшчэ адзін ліст — ад **спадара Уладзіміра Рудзінскага з Гомеля.** Кожны раз, — піша ён, — я з вялікім задавальненнем наведваю вёску Пасека Жыткавіцкага раёна, вёску, дзе нарадзіўся і рос, дзе прайшлі мае дзіцячыя і юнацкія гады. Аднак расказаць хачу не пра яе, а пра Кольна, што знаходзіцца за два кіламетры. Не пазнаць яго ў апошнія гады: асфальт, дыхтоўныя дамы... І жывуць у іх добрыя, працавітыя людзі. Летась іх сельгаспрадпрыемства занесена на раённую Дошку гонару, летась да жыхароў «прыйшоў» прыродны газ. Ёсць тут і ўсе ўмовы для адпачынку: бібліятэка, Дом культуры, некалькі крам.

Трэба адзначыць, што не кожная вёска можа пахваліцца і тым, што яе наведваў Прэзідэнт. А вось у Кольна ён прыязджаў двойчы, — піша **спадар Рудзінскі.** І дадае, што мясцовыя жыхары вельмі ўдзячныя кіраўніку дзяржавы за тое, што пры яго падтрымцы і ўвазе была пабудавана сучасная сярэдняя школа-дзіцячы сад, дзе створаны ўсе ўмовы для навучання і выхавання.

У свой час я таксама заканчваў Коленскую сярэднюю. Мы вучыліся ў старым непрыстасаваным будынку з пячным ацяпленнем пры газніцы... У нас нават электрычнасці не было, яна з'явілася пазней, калі я ўжо вучыўся ў старшых класах, — піша **Уладзімір Рудзінскі.** — А вось жаданне вучыцца ў большасці вучняў было — ды яшчэ і якое! Школа можа ганарыцца сваімі выпускнікамі, бо з яе сцен выйшлі добрыя людзі. Дарэчы, у Коленскай сярэдняй вучыўся Віктар Адамавіч Атліванаў, які цяпер працуе старшынёй нашага Жыткавіцкага райвыканкама. Карацей, скажу адно: у вёсцы Кольна жывецца вольна».

І для выратавання «неперспектыўных» паселішчаў можна нешта зрабіць. Прыклад? Ды калі ласка. «У вёсцы Вялікія Дворцы Пінскага раёна з'явіўся свой гісторыка-краязнаўчы музей. Стварылі яго мы, вяскоўцы: **Андрэй Палюховіч** (ён жа — аўтар ліста), **Марыя Вячорка, Уладзімір Федаровіч**. Экспанаты збіралі ўсе ахвотныя. Адкрыццё музея адбылося тры гады таму, і тады ў трох выставачных залах было 97 экспанатаў. Першым з іх стаў самавар 1876 года, пасля яго ў музеі сталі з'яўляцца прылады працы, адзенне, ткацкі станок, газета «Іскра» за снежань 1900 года, відэлец з гравіроўкай «1937 год», каваная дэталь з таўром «С. Висоцкі 1911 г.», электралічыльнік 1928 года, куфар 1900-га... І гэта — малая частка з трох тысяч экспанатаў, што размяшчаюцца ўжо ў дзевяці залах музея, у якіх за тры гады праведзена больш за 100 экскурсій».

Пра сваю малую радзіму расказаў і **спадар Анатоль Пярхальскі з Глыбокага**. расказаў, што яго вёсачкі Багатырова ўжо няма — на карце толькі аднайменнае ўрочышча, але ж памяць захоўвае ўсе імёны і прозвішчы вяскоўцаў, усе іх сцежкі-дарожкі. У пацвярджэнне гэтага шаноўны чытач даслаў свой малюнак: раптам некаму з нашчадкаў спатрэбіцца, бо...

ВАСІЛЬ Шукшын некалі пісаў, што людзі спачатку збіраюцца ў вялікіх гарадах, а потым разбягуцца ў чыстае поле.

Так гэта ці не, але ў многіх нашых людзей ёсць пакуль шанц пачынаць не з нуля: многіх чакае Бацькаўшчына. Можна сумаваць па ёй, можна перажываць, што нічога не можаш зрабіць (калі сапраўды не можаш), а можна, як сведчыць пошта, вярнуцца і сапраўды «ўпрыгожыць яе сваёй прысутнасцю», можна адкрыць аграсядзібу альбо музей, напісаць верш, намаляваць для нашчадкаў свайго роду карту з пазнакай, хто дзе жыў...

Што яшчэ можна зрабіць?

Пішыце, будзем думаць і рабіць разам, бо яно ж і сапраўды (паводле Паэта) «Хто раней, / хто пазней, / Толькі ўсе / Зноў і зноў / Мы прыходзім / Да простых, / як хлеб і паветра, / Высноў: / Што жыццё чалавеку — / Любому — / Даецца адно, / І што, / як ні надточвай, / Кароткае вельмі яно, / І што праўда на свеце / Адна — / Без крупінкі маны, / І што шчасця на свеце / Няма / Без сваёй стараны...

**Валянціна ДОЎНАР.**

# КАЛІ ПАМЕР МАЕ ЗНАЧЭННЕ



**ЯКУЮ бялізну — што прываблівае мужчынскія погляды ці функцыянальную і бяспечную — насіць жанчыне, ці ўплывае кармленне дзіцяці грудзьмі на іх форму, чым пагражае праседжванне ноччу ў сацсетках, і ў цэлым аб захаванні здароўя гутарым з загадчыкам аддзялення анка-2 (мамалагічнага) Гродзенскай абласной клінічнай бальніцы Аляксандрам ХОМБАКАМ.**



## ЯК ХВАЛІ ЎПЛЫВАЮЦЬ НА КЛЕТКУ

***— Аляксандр Міхайлавіч, давайце пачнём размову з таго, што вызначым, наколькі ўплывае эмацыянальны фон жанчыны на яе здароўе?***

— Ад эмацыянальнага стану залежыць узровень гармонаў: пазітыўны настрой вызначае баланс эстрагенаў і прагестынаў, а патрэбнае спалучэнне гэтых гармонаў становіцца ўплывае на структуру малочнай залозы. Адна з прычын, па якой у ёй адбываюцца змены (што прыводзіць да мастапатыі, а ў далейшым і да злаякасных новаўтварэнняў) — гэта парушэнне гарманальнага фону. На яго ўплывае практычна ўсё: хранічны стрэс, недахоп сну і фізічнай нагрузкі, і гэта адбіваецца на гарманальным дысбалансе. Апошні, у сваю чаргу, прыводзіць да значных змен у структуры малочнай залозы. Мінімальна — гэта кістозныя ўтварэнні, затым можа з'явіцца фіброзная тканка, што далей можа прывесці да ўтварэння злаякаснай клеткі. А калі на гэты фон напластоўваецца спадчынная схільнасць, рызыка развіцця раку значна павялічваецца.

У цэлым рак малочнай залозы з усіх злаякасных новаўтварэнняў у жанчын знаходзіцца на першым месцы. Таму каб прафілактаваць гэтае захворванне трэба падыходзіць, як мы кажам, да ўсяго правільна і прытрымлівацца здаровага ладу жыцця. Такое стаўленне да сябе складаецца з невялікай колькасці кампанентаў: гэта правільнае харчаванне, псіхаэмацыянальны стан, задаволенасць сваім жыццём, прафесіяй, пазітыўнае стаўленне да свету, імкненне максімальна адыходзіць ад шкодных фактараў, якія нас акружаюць і ўсё больш і больш спрабуюць...

***— ... узяць у кола?***

— Яны ўжо нас узялі. І мы павінны паспрабаваць разарваць ланцужок. З аднаго боку, гэта бытавая тэхніка, якой усё больш і больш. Яна — крыніца розных нізкачастотных хваляў, якія на нас уздзейнічаюць з усіх бакоў. А мы яшчэ імкнёмся, не ўсведамляючы таго, каб гэтае ўздзеянне было кругласутачным: камп'ютар, прас, чайнік уключаны, тэлефоны...

***— І фітнес-трэкер?*** — паказваю на модную навінку на сваёй руцэ.

— Ну вядома! А яшчэ чалавек прыдумаў, каб у святая-святых — спальні — паставіць тэлевізар, мабільнікі побач, што катэгарычна непрымальна. Ноччу неабходна спаць, і для гэтага прырода адвяла час — мінімум восем гадзін. Калькі сёння цывілізаваная прыгожая жанчына спіць і калі яна кладзецца? Пасля дванаццаці ночы, таму што працуе за камп'ютарам, сядзіць у сацыяльных сетках. Усё гэта шкодна. Калі цёмна, у вочы не павінна трапляць святло. Гэта час для мелатаніна (рэгулятара гармнальнай сістэмы). Калі ён з дзяцінства, юнацтва не выпрацоўваецца ў дастатковай колькасці, ужо ў маладосці пачынаюцца праблемы, якія прыводзяць да мастапатыі.

А цяпер моладзь тэму ўплыву тэхнікі не ўсведамляе. З аднаго боку — гэта ўзровень цывілізацыі — віртуальная рэальнасць, якая бярэ верх, а з другога — тэхніка выпраменьвае пэўныя хвалі, і яны паволна на нас дзейнічаюць. Доказана: тыя, хто вядзе начны лад жыцця — маюць вышэйшую рызыку развіцця паталагічных працэсаў у малочнай залозе, чым тыя, хто вядзе здаровы лад жыцця.

## УСЁ ВЫЗНАЧАЕ ГЕНЕТЫКА

***— Ці ўплывае памер грудзей на з'яўленне паталогіі?***

— Такой заканамернасці (чым больш малочная залоза, тым вышэйшая рызыка развіцця раку) і доказных даных няма. А вось чым большая яна па аб'ёме, тым складаней для дыягностыкі — такі момант існуе. Таму што яе памер вызначаецца не толькі жалезістай тканкай. У постменапаўзе аб'ём павялічваецца за кошт тлушчавай праслойкі, а жалезістая паменшаецца — яна становіцца невялікай, але агрэсіўнай. Малочная залоза вялікая, крыніца раку маленькая і пракантраляваць яе з-за аб'ёму ўжо складана. Не ўсялякі мамограф зможа ацаніць адэкватна, нават мамаграма можа прапусціць вонкавы квадрант, які не трапляе ў зону абследавання.

Я хачу сказаць, што пры вялікіх памерах грудзей верагоднасць злавіць анкалагічны працэс у пачатковай стадыі меншы, чым у каго яны меншыя. Чым большы памер, тым складаней для дыягностыкі.

***— Ці адбіваецца доўгае кармленне дзіцяці на наступных паводзінах малочнай залозы?***

— Доўгае кармленне дзіцяці — больш за паўгода — з'яўляецца фактарам абароны ад развіцця раку малочнай залозы. Нішто не можа ў прыродзе замяніць матчына малако! І нежаданне карміць сваё дзіця грудзьмі толькі таму, што зменіцца іх форма — таксама не апраўданне. Усе вызначае генетыка. У некаторых жанчын форма захоўваецца нават пасля трох родаў і наступнага кармлення, іншыя нараджаці адзін раз і выгляд іншы. Гэта — генетыка, тут ні пры чым кармленне.

***— Калі закранулі тэму генетыкі: наколькі спадчынная схільнасць можа ўплываць на развіццё анкапаталогій?***

— Існуе так званая спадчынная форма раку малочнай залозы, пры якой маюцца мутацыі генаў BRCA1/ BRCA2 (яны адказваюць за ўзнікненне раку малочнай залозы і раку яечнікаў). Мутацыі ў гэтых генах перадаюцца ад пакалення да пакалення і спрыяюць з'яўленню злаякасных пухлін. Рэалізацыя захворвання, хто мае мутацыі ў гэтых генах, да 80 %. Як правіла, у пакаленнях выразна прасочваецца сувязь у сваякоў першай-другой лініі: маці, сястра, цётка, бабуля. Адпаведна, гэтым жанчынам неабходна вызначыць мутацыі з пункту гледжання атрымання інфармацыі аб сваім здароўі і далейшым прагнозе.

***— Ці існуюць механізмы, якія стрымліваюць развіццё анкапаталогіі?***

— Так, вядома. Існуюць пэўныя рэчывы, якія блакуюцьназапашванне свабодных радыкалаў у арганізме, што ўплываюць на з'яўленне злаякаснай клеткі: вітаміны А, Е, С, лікапін, селен. Гэтыя важныя кампаненты, якія досыць эфектыўныя для прафілактыкі злаякасных утварэнняў (не толькі для прафілактыкі раку малочнай залозы, а ў цэлым усяго арганізма), розныя кампаненты-флаваноіды, якія спрыяюць ўтварэнню гармонаў у дастатковай колькасці, іх правільнаму балансу.

## ХАРЧУЕМСЯ І АПРАНАЕМСЯ ПРАВІЛЬНА

***— У кітайцаў ёсць падыход «ежа — як лекі» (яны не любяць лячыцца, але аддаюць перавагу пэўнаму набору прадуктаў, багатаму мікраэлементамі, вітамінамі, ужыванне якіх замяняе ім паход да ўрача). Чым харчавацца, каб заставацца здаровай?***

— Прынцып філасофіі, якую вызнаюць кітайцы, абсалютна слушны: у арганізм павінны трапляць рэчывы і кампаненты, у якіх ён мае патрэбу паўсядзённа. Ва ўсіх, напэўна, на слыху міжземнаморская дыета. Гэта галоўным чынам морапрадукты. Яны багатыя на антыаксіданты, пра якія мы ўжо казалі: вітаміны А, Е, С, селен і гэтак далей. У дыеце менш рэчываў, якія мы лічым смачнымі, але яны шкодныя для нас — жывёльныя тлушчы і ў вялікай колькасці.

***— А як жа кавалачак сальца?***

— Вядома, кавалачак сала з цыбулькай-часначком — гэта цудоўна! Але тры разы на дзень наўрад ці неабходна. Я хачу сказаць: чым разнастайнейшае харчаванне, тым больш гэта мэтазгодна для арганізма. Галоўнае — не кідацца да крайнасцяў, выбіраючы супермодныя дыеты ў надзеі, што яны створаць цуды.

***— Ці можна казаць пра ўзаемасувязь няправільна падабранага, напрыклад, бюстгальтара «з костачкамі» і лакалізацыяй паталогіі ў месцы пастаяннага траўмавання?***

— Вядома, бялізна мае вялікае значэнне. У цэлым, ёсць агульныя патрабаванні: яна павінна быць зручнай, бясшоўнай і «дыхаць». Натуральна, яна не павінна траўмаваць цела. Гэта датычыцца модных бюстгальтараў «з костачкамі» — яны траўмуюць тканкі малочнай залозы. Усе траўмы (нават дзесяцігоддзі таму) абавязкова рэалізуюцца, і маецца выразная сувязь паміж атрыманай траўмай і ўзнікненнем анкалагічнага працэсу. Бываюць траўмы вострыя (удар, напрыклад) і хранічныя (тыя ж «костачкамі»). Гэта ўздзеянне на жалезістую тканку, ацёк у гэтай зоне і фактар рызыкі развіцця новаўтварэнняў. Таму неабходна знайсці баланс паміж прыгажосцю і ўласным камфортам.

***— Калі мы ўжо згадалі фактары рызыкі, давайце пералічым іх...***

— На першым месцы знаходзіцца спадчынная схільнасць з мутацыяй генаў BRCA1/ BRCA2. Фактарам рызыкі з'яўляецца ўзрост пацыентак: пасля 50 гадоў развіццё раку малочнай залозы ўзрастае. Захоўваецца значная рызыка раку другой малочнай залозы ў жанчын, якія перанеслі рак у адной з іх. Небяспечныя моцнае іанізацыйнае апрамяненне, праліфератыўныя фіброзна-кістозныя змены.

Сярэднія і менш інтэнсіўныя фактары рызыкі: ранні пачатак першай менструацыі (да 13 гадоў), позняя першая цяжарнасць (пасля 30 гадоў), адсутнасць або кароткае кармленне грудзьмі дзіцяці, адсутнасць родаў, позняя менапаўза (пасля 54 гадоў), атлусценне ў постменапаўзе, захворванні жаночай рэпрадуктыўнай сістэмы (рак яечнікаў, рак цела маткі, перанесеныя траўмы малочнай залозы, масты). Са шкодных звычак на першым месцы — алкаголь. Нават не гаворым аб аб'ёмах: рэгулярнае спажыванне алкаголю адносіцца да фактараў рызыкі.

***— Наколькі эфектыўная скрынінгавая праграма па ранім выяўленні раку малочнай залозы сярод жанчын ва ўзросце 50—69 гадоў?***

— На сёння даных, што будуць знойдзены эфектыўныя лекі ад раку, няма. А калі так, то трэба разлічваць на рэальныя магчымасці — гэта лячэнне анкалагічнага працэсу ў пачатковай стадыі. А выявіць яго мы можам. На гэта накіраваны скрынінг. Пацыентак з першай стадыяй раку малочнай залозы выяўляем больш чым у 50 % выпадкаў, калі сярод агульнай катэгорыі толькі 35—36 %. У скрынінгавай групе з першай-другой стадыямі — 90 %. Вядомая доказная заканамернасць: пры лячэнні рака малочнай залозы першай стадыі пяцігадовая выжывальнасць дасягае да 90 %. Другая стадыя — крыху ніжэй. А ў цэлым, гэта самы лепшы вынік лячэння. Скрынінг вельмі эфектыўны і альтэрнатывы яму сёння няма.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

# ШМАТКІ СУПРАЦЬ КАШЫ

## Якім павінен быць сняданак

**Ці праўда, што аўсяныя шматкі хуткага прыгатавання менш карысныя, чым авёс? Усе мы шануем шматкі за сытнасць і хуткасць прыгатавання, а таксама за іх пяшчотны смак. Але ці не губляем мы штосьці важнае, эканомячы час?**

— Авёс утрымлівае такія карысныя рэчывы, як клятчатка, ненасычаныя тлустыя кіслоты, мікраэлементы — жалеза, кальцый, калій, фосфар і цынк, вітаміны А, В1, В6, Е, К, РР. Аўсяная каша паляпшае страваванне, садзейнічае ўмацаванню сасудаў, зніжае ўзровень халестэрыну, — тлумачыць **урач-гігіеніст Мінскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Вольга ФІНСКАЯ.** — Аднак варта памятаць, што ў працэсе вытворчасці шматкоў хуткага прыгатавання зерне праходзіць працэс ачышчэння ад абалонак і зародка, шліфуецца, здрабняецца і папярэдне прапарваецца ці праходзіць апрацоўку высокім ціскам. У выніку губляецца мноства карысных рэчываў, якія якраз і ўтрымліваюцца менавіта ў зародку і абалонцы зерня. А вялікая колькасць крухмалу, які хутка засвойваецца арганізмам, застаецца.

А менавіта прадукты распаду крухмалу ўскладняюць работу падстраўнікавай залозы і павышаюць рызыку развіцця цукровага дыябету. Акрамя таго, каларыйнасць стравы са шматкоў вышэйшая, чым з натуральных прадуктаў. А гэта важна для тых, хто вядзе пільны падлік калорый.

Таксама не трэба забываць, што вытворцы дадаюць у кашы хуткага прыгатавання дабаўкі, якія не дазваляюць злежвацца, падсалоджвальнікі і араматызатары.

Таму калі жадаеце атрымаць з ранішняга сняданку максімум карысці, вітамінаў і мікраэлементаў, гатуйце кашы з цэльных злакаў. Яны маюць прапарцыянальнае спалучэнне пажыўных рэчываў і клятчаткі. Дзякуючы гэтаму вугляводы і тлушчы засвойваюцца павольна і надоўга насычаюць наш арганізм. А гэта садзейнічае зніжэнню вагі, ачышчэнню арганізма, падтрыманню балансу карысных рэчываў, а значыць і добраму настрою, і энергіі на ўвесь дзень.

**Важна памятаць.** Аўсяная каша хоць і лічыцца тым прадуктам, які абавязкова павінен быць у рацыёне для пахудзення, аднак у 100 грамах прадукту налічваецца 350 калорый. І гэта без уліку дабавак у выглядзе малака, цукру, мёду ці арэхаў. Ешце, але ведайце меру!

**Алена КРАВЕЦ.**

За кадрам

# У ФІНАЛЕ АДБОРУ НА «ЕЎРАБАЧАННЕ» — АРТЫСТЫ З БЕЛАРУСІ, ШВЕЦЫІ І НІГЕРЫІ

**4 лютага ў сценах Белтэлерадыёкампаніі адбылося праслухоўванне прэтэндэнтаў на ўдзел у міжнародным конкурсе «Еўрабачанне-2019», што пройдзе сёлета ў Тэль-Авіве. Да вочнага этапу дабраліся, праўда, не ўсе 113 артыстаў і калектываў, якія адправілі заяўкі з 16 краін свету, — гэта найвялікшая колькасць удзельнікаў адбору за апошнія сем гадоў. Але ўсё адно фокус-групе экспертаў, у якую ўвайшлі музычныя прадзюсары, папулярныя выканаўцы, кіраўнікі музычных калектываў, тэлевядучыя і прадстаўнік Міністэрства культуры, давялося правесці каля пяці гадзін у рэжыме жывых спеваў. Па выніках праслухоўвання былі вызначаны дзесяць удзельнікаў фінальнага гала-канцэрта, які пройдзе ў тэрмін да 8 сакавіка — і менавіта падчас яго стане вядомы прадстаўнік нашай краіны на песенным шоу.**



Беларуская «Хваля», якую дасылаў гурт «Рэха» і Андрусь Такінданг, захапіла рытмам усю публіку ў тэлестудыі, але, як палічылі члены фокус-групы музычных экспертаў, не стала дастаткова перакананаўчай для фіналу.

Як ні крыўдна, гледачы ў гэтым годзе будуць толькі пасіўнымі назіральнікамі — выбар у прамым эфіры адкрытым галасаваннем зробіць журы, склад якога пакуль што не называецца. Але гэта не значыць, што нам з вамі не варта ведаць, сярод каго, уласна кажучы, профі выбіраюць музычна-



Гурт «Аўра» — адзіны беларускамоўны ўдзельнік фінальнай дзясяткі.

га дэлегата ад Беларусі: хто яны, удзельнікі фінальнай дзясяткі, і пра што спяваюць. Расказваем крыху больш пра канкурсантаў — у тым парадку, у якім мы ўбачым іх на гала-канцэрце, паводле жараб'ёўкі.

**1. Michael Soul — Humanize**

Ураджэнцу Брэста Міхаілу Сасунову 22 гады, большую частку якіх юнак займаецца музыкай і з пераменным поспехам удзельнічае ў самых розных эстрадных конкурсах. Летась, напрыклад, Міхаіл бліскуча выступіў ва ўкраінскім шоу «Голас краіны», хоць і не дайшоў да фіналу. А яшчэ ён ужо заяўляў аб сабе на нацыянальным адборы (у 2015 годзе ў складзе эпатажнага хлапчуковага дуэта The EM) і нават выступаў на «Еўрабачанні», праўда, у якасці бэк-вакаліста NaviBand. Конкурсную песню Міхаіл прадстаўляе як «сацыяльную баладу, што закранае праблемы сучаснага грамадства», — просьбу да кожнага слухача быць крыху больш міласэрным у наш няпросты час.

**2. ЗЕНА — Like it**

Зіне Курпяновіч 16 гадоў, і яна самая юная сярод фіналістаў, але ўжо загартаваная артыстка: за яе плячыма выступленні на «Славянскім базары» і «Новай хвалі», удзел у адборах дзіцячага «Еўрабачання», вучоба ў эстраднай акадэміі Ігара Крутога і супрацоўніцтва з Нацыянальнай музычнай карпарацыяй Віктара Дробыша. Уласна, менавіта сваім першым прадзюсарам ажно да фіналу забараніў маладой спявачцы зносіны з прэсай.

**3. Ева Коган — Run**

Дзяўчыне сёлета споўніцца 19, яна вучыцца ў Мінскім дзяржаўным каледжы мастацтваў і менавіта з музыкай планue звязваць сваю будучыню. На рахунку маладой спявачкі — 3-е месца ў рэспубліканскім конкурсе «Маладыя таленты Беларусі» і паспяховыя выступленні ў шэрагу іншых беларускіх і міжнародных конкурсаў. Патэнцыйны хіт для «Еўрабачання» ёй напісалі кампазітар Леанід Шырын і паэтка Наталля Тамбоўцава.

**4. Эмануэль Імагбэ (Нігерыя) — Champion**

Сціплы студэнт Віцебскага медуніверсітэта, «містар ВДМУ — 2018» амаль усё праслухоўванне засяроджана прасядзеў у кутку і настройваўся, а напрыканцы выйшаў і прадэманстраваў усім астатнім, як трэба спяваць соўл, — каб выкананне прабірала да мурашоў на спіне. Наогул, 24-гадовы Эмануэль Імагасакуа Імагбэ — найменш «раскручаны» з усіх фіналістаў, але тым і цікавы: словы песні «Чэмпіён» ён напісаў сам за пару тыдняў, з музыкай дапамог сябар-электроншчык BLGN, а вынік такі, што многім варта пазайздросціць.



Спявак са Швецыі Себасцьян Рос чымсьці нагадвае ўсіх вакалістаў вядомых шведскіх гуртоў, разам узятых.

**5. Sebastian Roos (Швецыя) — Never Getting Close**

37-гадовы Себасцьян Карл Рос — асоба даволі вядомая не толькі ў роднай Швецыі, але наогул у Еўропе, дзе шмат гастралюе з кавер-гуртом Liverpool і перапявае хіты The Beatles. І хоць сам музыкант сцвярджае, што захапляецца цяжкай музыкай, але на суд журы беларускага адбору ён вынес тыповую ванільную баладу шведска-іспанскага аўтарства — мы сотні разоў чулі падобныя ад шведскіх выканаўцаў і яшчэ столькі ж пачуем...

**6. Алена Гарбачова — Can we dream**

Яшчэ адна ўраджэнка Брэста, вядомая па працы з музычным калектывам VIP Jazz, якая не толькі шмат выступае ў якасці клубнай спявачкі, але таксама працуе педагогам па вакале ў прадзюсарскім цэнтры «Спамаш». Удзельнічала ў беларускім адборы на «Еўрабачанне» яшчэ ў 2012 годзе, але да фіналу дабралася толькі цяпер.

**7. Гурт «PRAвакацыя» — Running Away From The Sun**

Дуэт студэнтаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў Арцёма Саладухі і Марка Вайтко быў створаны ў 2015 годзе як прадзюсарскі праект ды так і застаўся на сцэне, штурмуючы то «Песню года», то адбор на «Еўрабачанне». Цяпер хлопцы — салісты Маладзёжнага тэатра эстрады і ўдзельнікі мноства канцэртных праграм і маладзёжных дыскатэк. А песню, з якой удзельнікі гурта абяцаюць сёлета «парваць фінал», ім напісаў модны аўтар і спявак Кірыл Гуд.

**8. Гурт «Аўра» — «Чаравала»**

Гурт вядомы як сямейны і творчы дуэт спявачкі і паэткі Юліі Быкавай і кампазітара, прадзюсара Яўгена Алейніка. Для «Еўрабачання» сабе і іншым артыстам яны напісалі разам ужо 11 (!) песень. Але на гэты раз аўтарам конкурснай песні выступіў толькі Яўген, а Юлія ўзяла на сябе выкананне і сцэнічнае ўвасабленне чараўніцтва купальскай ночы. Нягледзячы на тое што праслухоўванне яна праходзіла з тэмпературай і хворым горлам, нумар «Аўры» атрымаўся бездакорным і ўпэўнена трапіў у фінальную дзясятку (а меншага ніхто і не чакаў: званне лаўрэатаў прэміі «За духоўнае адраджэнне» абавязвае трымаць найвышэйшую планку). «Як бы ні склаліся абставіны далей, нашы песні працягваюць жыць незалежна ад «Еўрабачання», — заўважыла спявачка, — і гэтая таксама будзе гучаць».

**9. NAPOLI — Let it go**

Вольга Шыманская пяць разоў сольна і ў складзе музычнага гурта ўдзельнічала ў нацыянальным адборы ў Беларусі (у фінале займала месцы ад 8-га да 2-га) і адзін раз у Польшчы, а паміж конкурснымі гонкамі паспела выпусціць 15 сінглаў, зняцца ў некалькіх музычных кліпах і даць безліч канцэртаў. Сёлета конкурсную песню спявачцы напісала яшчэ адна фіналістка беларускіх адбораў на «Еўрабачанне» Аляксандра Ткач.

**10. КейСі — No Love Lost**

Мінчанка Кацярына Смольская — менавіта так па пашпарце завуць спявачку, якая склала сцэнічны псеўданім з ініцыялаў, — на сцэне ўсяго некалькі гадоў, але ўжо заявіла аб сабе і ў радыёэфірах, і ў тэлефестывалі «Песня года Беларусі», і ўвосень цяпер на нацыянальным адборы «Еўрабачання». Некалі доўга сумнявалася, ці варта наогул займацца музыкай, таму экзамены ў музычнай школе давялося здаваць экстэрнам, затое цяпер дзяўчына — выпускніца факультэта філасофіі і сацыяльных навук БДУ — працуе ў прадзюсарскім цэнтры, сама вучыць музыцы і спевам дзяцей і, здаецца, знайшла сваю нішу на вялікай сцэне.

...Агульнае ўражанне ад беларускага адбору на «Еўрабачанне» ўзору 2019 года, шчыра кажучы, дзіўнае. З аднаго боку, вялікая колькасць замежных легіянераў значна разнастаіла карцінку і гучанне, зрабіла працэс цікавейшым і ўзмацніла канкурэнцыю. З другога — хоць гэта, канешне, у найменшай ступені праблема Белтэлерадыёкампаніі, — нягледзячы на заклік арганізатараў конкурсу да разнастайнасці, каторы год запар мы спрабуем здзівіць Адэсу, прабачце, Еўропу старымі штукамі, між тым як лік заявак на беларускай мове не перавышае 10 % ад агульнай колькасці. Спадарства, такіх песень і сёлета было ўсяго 7, а добрых яшчэ менш — і хоць бы дзеля гэтага варта было паклікаць у фінал Андрэя Такінданга з гуртом «Рэха» і пазітыўнай песняй «Хваля». А галоўнае, здаецца, многія беларускія артысты дагэтуль не навучыліся выходзіць на сцэну не сцяўшы зубы, а з усмешкай, каб атрымаць і падарыць слухачам задавальненне. Мо тады варта зноў зладзіць «выбар без выбару» — пераbраць найбольш паспяховых нашых удзельнікаў і прызначаць з іх ліку наступнага канкурсанта ўласным рашэннем арганізатараў, каб сэканоміць час, нервы і сродкі?



Прадзюсар Віктар Дробыш гаварыў, што не плануе сёлета ўдзельнічаць у конкурснай гонцы «Еўрабачання», аднак яго падапечная ЗЕНА (Зіна Купрыяновіч) падала заяўку на адбор — і прайшла!

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ і www.tvr.by**

Не прапусці!

## Шоу на стыку рэальнасці і фантазіі

**Фестываль гіганцкіх кітайскіх ліхтароў упершыню пройдзе ў Батанічным садзе.**

Шоу было створана кітайскай кампаніяй Haitian Culture на аснове старажытных традыцый і сучасных тэхналогій. Натхненнем для стваральнікаў стала Свята ліхтароў — адна са старажытных традыцый, якой ужо больш за дзве тысячы гадоў. Яго адзначаюць у завяршальны дзень двухтыднёвага кітайскага Новага года. Па ўсім Кітаі жыхары запальваюць ліхтарыкі ў сваім жыллі, у многіх рэгіёнах краіны праходзяць яркія прадстаўленні, якія дэманструюць мастацтва ліхтароў ва ўсёй яго разнастайнасці.

Цяпер часцінка сапраўднай кітайскай традыцыі прыедзе і ў Мінск. У Цэнтральным батанічным садзе будзе выстаўлена больш за 25 маштабных светлавых кампазіцый, якія ўключаюць больш як 500 аб'ектаў. Кожная фігура — гэта вынік працы дзясяткаў майстроў і міні-шэдэўр. Трывалы стальны каркас па-майстэрску накрыты рознакаляровай тканінай, якая падсвечваецца знутры, дзякуючы чаму, нягледзячы на свой немаленькі памер, экспанаты здаюцца абсалютна бязважкімі.

На маляўнічай тэрыторыі Цэнтральнага батанічнага саду ўсіх чакае цудоўнае падарожжа ў свет казкі, дзе вас сустрэнуць дзівосныя жывёлы, птушкі, расліны і многія іншыя вобразы на стыку рэальнасці і фантазіі. Гасцей чакаюць



на Фестывалі гіганцкіх ліхтароў з 14 лютага да 31 сакавіка з 18.00 да 22.30, паколькі апошнія выглядаюць асабліва эфектна менавіта ў вячэрні і начны час.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельоблстрой» (продавец), в лице антикризисного управляющего в деле о банкротстве Колеснева Н. М. извещает о проведении 21 февраля 2019 года открытого повторного аукциона по продаже имущества со снижением начальной цены на 10 % в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, без учета НДС (20 %), бел. руб. | Шаг аукциона – 5 %, бел. руб. | Сумма задатка, без учета НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| **Местонахождение лотов №№ 1–4:** Гомельская обл., Буда-Кошелевский р-н, г. Буда-Кошелево, ул. Техническая, 11. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **320550100003000043** общей площадью **2,5873 га (право постоянного пользования). Целевое назначение земельного участка:** для размещения объектов административно-управленческого назначения. **Условие продажи:** земельный участок под объект продажи будет выделен по заявке нового собственника согласно законодательству РБ (предварительная схема пользования земельного участка под объекты продаж прилагается). **ПРИМЕЧАНИЕ:** в соответствии с действующим Законодательством РБ (в части изменения подпункта 2.30 пункта 2 статьи 115 в Налоговом кодексе РБ с 1 января 2019 года) **реализация имущества осуществляется без учета НДС 20 %** | | | | |
| 1 | **Капитальное строение с инв. № 321/С-1710**, общей площадью **218,4 кв. м**, назначение – здание специализированное для производства строительных материалов, наименование – **одноэтажное кирпичное здание арматурного цеха. Адрес:** Гомельская обл., Буда-Кошелевский р-н, г. Буда-Кошелево, ул. Техническая, 11/13, здание арматурного цеха. **Капитальное строение с инв. № 321/С-1719**, общей площадью **365,9 кв. м**, назначение – здание специализированное для производства строительных материалов, наименование – **одноэтажное кирпичное здание столярно-механического цеха с пристроенным сараем. Адрес:** Гомельская обл., Буда-Кошелевский р-н, г. Буда-Кошелево, ул. Техническая, 11/10, здание столярно-механического цеха. **Капитальное строение с инв. № 321/С-1712**, общей площадью **518,0 кв. м**, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – **одноэтажное кирпичное здание сборочного цеха. Адрес:** Гомельская обл., Буда-Кошелевский р-н, г. Буда-Кошелево, ул. Техническая, 11/11, здание сборочного цеха. **Капитальное строение с инв. № 321/С-1717**, общей площадью **111,9 кв. м**, назначение – здание нежилое, наименование – **одноэтажное кирпичное здание бытового помещение. Адрес:** Гомельская обл., Буда-Кошелевский р-н, г. Буда-Кошелево, ул. Техническая, 11/9, здание бытового помещения. **Капитальное строение с инв. № 321/С-1721**, общей площадью **316,1 кв. м**, назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, наименование – **одноэтажное кирпичное здание лесопильного цеха. Адрес:** Гомельская обл., Буда-Кошелевский р-н, г. Буда-Кошелево, ул. Техническая, 11/8, здание лесопильного цеха. **Капитальное строение с инв. № 321/С-1715**, общей площадью **16,4 кв. м**, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – **одноэтажное кирпичное здание трансформаторной подстанции. Адрес:** Гомельская обл., Буда-Кошелевский р-н, г. Буда-Кошелево, ул. Техническая, 11/14, здание трансформаторной подстанции. **Капитальное строение с инв. № 321/С-8915**, общей площадью **532,3 кв. м**, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – **открытая бетонная кран-эстакада. Адрес:** Гомельская обл., Буда-Кошелевский р-н, г. Буда-Кошелево, ул. Техническая, 11/12, здание открытой кран-эстакады. **Подробный и полный перечень имущества по лоту № 1 опубликован в газете «Звязда» от 19.12.2018 г. № 2446 (28860)** | **197 551,80** | 9 877,59 | 19 755,18 |
| 2 | **Капитальное строение с инв. № 321/С-1714**, общей площадью **459,8 кв. м**, назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **двухэтажное административное кирпичное здание.** Составные части и принадлежности: двухэтажное административное кирпичное здание с крыльцом, двумя мощениями, фонтаном (водоемом). **Адрес:** Гомельская обл., Буда-Кошелевский р-н, г. Буда-Кошелево, ул. Техническая, 11. **Капитальное строение с инв. № 321/С-1723**, общей площадью **220,7 кв. м**, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранения, наименование – **одноэтажное здание смешанной конструкции (блоки и металлическая сетка) материального склада. Адрес:** Гомельская обл., Буда-Кошелевский р-н, г. Буда-Кошелево, ул. Техническая, 11/7, здание материального склада. **Капитальное строение с инв. № 321/С-1716**, общей площадью **245,3 кв. м**, назначение – здание специализированное коммунального хозяйства, наименование – **одноэтажное кирпичное здание материального склада с пристроенным навесом. Адрес:** Гомельская обл., Буда-Кошелевский р-н, г. Буда-Кошелево, ул. Техническая, 11/6, здание материального склада. Канализационные сети (инв. № 982). Туя брабант в кол-ве 10 шт. (инв. № 112-121). Котел стальной твердотопливный бытовой КСТБ-50 (инв. № 127). Насос URS 32-120 (инв. № 881). Забор кирпичный (инв. № 986) | **118 065,65** | 5 903,28 | 11 806,57 |
| 3 | **Здание навеса** (инв. № 150а). **Капитальное строение с инв. № 321/С-1932**, общей площадью **103,7 кв. м**, назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – **одноэтажное кирпичное здание материального склада. Адрес:** Гомельская обл., Буда-Кошелевский р-н, г. Буда-Кошелево, ул. Техническая, 11/4, здание материального склада. **Капитальное строение с инв. № 321/С-1711**, общей площадью **1 052,1 кв. м**, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – **одноэтажное железобетонное здание склада с гаражом. Адрес:** Гомельская обл., Буда-Кошелевский р-н, г. Буда-Кошелево, ул. Техническая, 11/3, склад с гаражом. **Капитальное строение с инв. № 321/С-1718**, общей площадью **53,2 кв. м**, назначение – здание специализированное коммунального хозяйства, наименование – **одноэтажное кирпичное здание проходной с автовесовой.** Составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание проходной с автовесовой, металлическими воротами, четырьмя заборами. **Адрес:** Гомельская обл., Буда-Кошелевский р-н, г. Буда-Кошелево, ул. Техническая, 11/1, здание проходной. **Подробный и полный перечень имущества по лоту № 3 опубликован в газете «Звязда» от 19.12.2018 г. № 2446 (28860)** | **135 053,98** | 6 752,70 | 13 505,40 |
| 4 | **Капитальное строение с инв. № 321/С-1720**, общей площадью **399,5 кв. м**, назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – **одноэтажное кирпичное здание автогаража на 25 автомашин. Адрес:** Гомельская обл., Буда-Кошелевский р-н, г. Буда-Кошелево, ул. Техническая, 11/2, здание гаража на 25 автомашин. **Подробный и полный перечень имущества по лоту № 4 опубликован в газете «Звязда» от 19.12.2018 г. № 2446 (28860)** | **53 348,36** | 2 667,42 | 5 334,84 |

**Продавец:** ОАО «Гомельоблстрой», г. Гомель, ул. Малайчука, 12. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.:** 8 (029) 185-37-18 – управляющий в деле о банкротстве Колеснев Николай Михайлович; 8 (044) 769-19-61, 8 (0232) 53-27-62 – по недвижимости Яроцкая Людмила Николаевна. **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона. Для участия в аукционе необходимо: 1**. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 6 февраля 2019 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00. Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 19 февраля 2019 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. **Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за 5 (пять) дней до его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником** (претендентом на покупку), объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором торгов** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента его подписания и возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части) и с Законом РБ от 13.07.2012 № 415-З (ред. от 04.01.2014) «Об экономической несостоятельности (банкротстве)», ст. 127–129. **Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 19.12.2018 г. № 2446 (28860). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы» и www.bankrot.gov.by. Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62**

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельоблстрой» (продавец имущества), в лице антикризисного управляющего в деле о банкротстве Колеснева Н. М. извещает о проведении 22 февраля 2019 года открытого повторного аукциона по продаже имущества со снижением начальной цены на 25 % в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, без учета НДС (20 %), бел. руб. | Шаг аукциона – 5 %, бел. руб. | Сумма задатка, без учета НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| **Условие продажи: 1.** Претендент на покупку (победитель) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. **2.** Действия по снятию с регистрационного учета транспортных средств, а также в случае необходимости получения регистрационных документов (при их отсутствии у Продавца) производится Покупателем на основании выданной доверенности Продавцом, за его счет и его силами. Переоформление документов на автотехнику и механизмы производится за счет покупателя. **3.** Земельный участок под объект продажи будет выделен по заявке нового собственника, согласно законодательству РБ (предварительная схема пользования земельного участка под объекты продаж прилагается). **ПРИМЕЧАНИЕ:** В соответствии с действующим Законодательством РБ (в части изменения подпункта 2.30 пункта 2 статьи 115 в Налоговом кодексе РБ с 1 января 2019 года) **реализация имущества осуществляется без учета НДС 20 %** | | | | |
| **Местонахождение лотов №№ 1–4:** Гомельский р-н, Зябровский с/с, п. Кореневка. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **321083603601000016** общей площадью **7,3619 га (право постоянного пользования, доля в праве 299/500). Местонахождение:** Гомельская обл., Гомельский р-н, Зябровский с/с, п. Кореневка, ул. Зеленая, 4. **Целевое назначение земельного участка:** для размещения объектов оптовой торговли, материально-технического и продовольственного снабжения, заготовок и сбыта продукции | | | | |
| 1 | **Капитальное строение с инв. № 310/С-3118** общей площадью **5 343,6 кв. м**, назначение – здание главного корпуса базы, наименование – **здание главного корпуса базы. Адрес:** Гомельский р-н, Зябровский с/с, п. Кореневка. **Капитальное строение с инв. № 310/С-53543** общей площадью **156,5 кв. м**, назначение – здание специализированное энергетики, наименование – **котельная. Адрес:** Гомельский р-н, Зябровский с/с, п. Кореневка, ул. Зеленая,4/17. **Подробный и полный перечень имущества по лоту № 1 опубликован в газете «Звязда» от 14.11.2018 г. № 219 (28835)** | **906 352,50** | 45 317,63 | 90 635,25 |
| **Местонахождение лотов №№ 2–4, 6–11:** Гомельский р-н, Зябровский с/с, п. Кореневка | | | | |
| 2 | **Изолированное помещение с инв. № 310/D-1736**, общей площадью **1 298,6 кв. м**, назначение – помещение административно-бытового корпуса, наименование – **помещение административно-бытового корпуса. Адрес:** Гомельский р-н, Зябровский с/с, п. Кореневка, пом. 1. Бордюр (инв. № 00000082); покрытие из железобетонных плит (инв. № 00400068). Отопительный котел «Мир 95» (инв. № 11-1) | **207 840,00** | 10 392,00 | 20 784,00 |
| 3 | **Капитальное строение с инв. № 310/С-4428**, общей площадью **29,9 кв. м**, назначение – здание нежилое (проходная), наименование – **одноэтажное кирпичное основное строение. Адрес:** Гомельский р-н, Зябровский с/с, п. Кореневка. Асфальтовое покрытие (инв. № 0002003); ворота металлические (инв. № 0002005); Шлагбаум Е-713, 6 м инв. № 0004033 | **22 897,50** | 1 144,88 | 2 289,75 |
| 4 | **Капитальное строение с инв. № 310/С-2990**, общей площадью **5 928,0 кв. м**, назначение – здание специализированное складов, торг. в.х баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **материальные склады. Адрес:** Гомельский р-н, Зябровский с/с, п. Кореневка. Асфальтовое покрытие (инв. № 00000097) участок 2; ограждение из железобетона (инв. № 0002004) | **572 932,50** | 28 646,63 | 57 293,25 |
| 6 | **Автобус MAZ 256270**, кузов (рама) № Y3M25627090001336, 2009 года выпуска, рег. № АВ 9158-3, инв. № 50024 | **8 475,00** | 423,75 | 847,50 |
| 7 | **Грузовой седельный тягач MAZ 54322**, кузов (рама) № Б/Н, год выпуска не определен, рег. № АЕ 9263-3 (инв. № 0005007). **Полуприцеп бортовой MAZ 9758002010**, кузов (рама) № Y3M97580090011574, 2009 года выпуска, рег. № А 3213А-3, инв. № 50023 | **6 000,00** | 300,00 | 600,00 |
| 8 | **Грузовой специальный сортоментовоз MAZ 631708244P2**, кузов (рама) № Y3M63170890000542, 2009 года выпуска, рег. № АВ 9202-3. **Прицеп специальный сортоментовоз MAZ 837810020**, кузов (рама) № Y3M83781090012216, 2009 года выпуска, рег. № А 3219 А-3, инв. № 0040062. **Манипулятор гидравлический М-75-04**, инв. № 00400063 | **40 950,00** | 2 047,50 | 4 095,00 |
| 9 | **Грузовой седельный тягач MAZ 6422A5320**, кузов (рама) № Y3M6422A590000949, 2009 года выпуска, рег. № АВ 9155-3, инв. № 50022. **Полуприцеп бортовой MAZ 9758002010**, кузов (рама) № Y3M97580090011691,2009 года выпуска, рег. № А 3231 А-3, инв. № 00400059 | **14 775,00** | 738,75 | 1 477,50 |
| 10 | **Грузовой бортовой тентовый автомобиль MAZ 437130332**, кузов (рама) № Y3M437130A0000384,2010 года выпуска, рег. № АЕ 6786-3, инв. № 02000041. **Автобус GAZ-322132**, кузов (рама) № 322100A0451878 / № X96322132A0675534, 2010 года выпуска, рег. № АЕ 6787-3, инв. № 02000042 | **8 250,00** | 412,50 | 825,00 |
| 11 | **Грузовой специальный сортиментовоз URAL 432063771A**, кузов (рама) № X8963771A60AR3011, 2006 года выпуска, рег. № АА 9016-3, инв. № 10-4. **Прицеп специальный сортиментовоз 89662**, кузов (рама) № X1L89662060000004, 2006 года выпуска, рег. № 0870 АА-3, инв. № 10-5. **Автобус GAZ-322132**, кузов (рама) № Б/Н/№ X9632213290639777, год выпуска не определен, рег. № АВ 9213-3, инв. № 00400061 | **28 050,00** | 1 402,50 | 2 805,00 |
| **Местонахождение лотов №№ 12–22:** г. Добруш, пер. Крылова, 4 | | | | |
| 12 | **Автомобиль грузовой специальный кран МАЗ 5337А2 КС3579402**, инв. № 890, рег. № АЕ 7136-3 | **20 100,00** | 1 005,00 | 2 010,00 |
| 13 | **Погрузчик универсальный «АМКОДОР» 332С4**, инв. № 40627, рег. № б/н. **Экскаватор ЭО2621 56-68** (0,25 куб. м), инв. № 425, рег. № 5668 ГБ. **Прицеп БТВ 14-10**, инв. № 428; рег. № ГА 7551 | **28 785,00** | 1 439,25 | 2 878,50 |
| 14 | **Автобус ПАЗ 32053**, инв. № 1-762, рег. № АВ 2384-3 | **6 600,00** | 330,00 | 660,00 |
| 15 | **Автомобиль грузовой самосвал МАЗ 6501 А8 320021**, инв. № 10296, рег. № АЕ 8688-3 | **23 925,00** | 1 196,25 | 2 392,50 |
| 16 | **Автомобиль МАЗ 6501 А8 320021**, инв. № 10295, рег. № АЕ8687-3. **Прицеп МАЗ 856100-(015)**, инв. № 10509, рег. № А 5089 А-3 | **32 475,00** | 1 623,75 | 3 247,50 |
| 17 | **Автомобиль ГАЗ 32213,** г. в. 2008, инв. № 885-1, рег. № АВ 4679-3 | **2 550,00** | 127,50 | 255,00 |
| 18 | **Автомобиль ГАЗ 32213- 288**, инв. № 1-814, рег. № АЕ 9430-3 | **3 450,00** | 172,50 | 345,00 |
| 19 | **Автомобиль грузовой специальный кран КАМАЗ 65115 65 КС 55713 1В**, инв. № 883, рег. № АЕ 0633-3 | **51 450,00** | 2 572,50 | 5 145,00 |
| 20 | **Погрузчик универсальный «АМКОДОР» 342С4,** № 1233, инв. № 10298, рег. № ЕВ-3 4833.<br>Навесное оборудование на универсальный погрузчик «АМКОДОР» 342С4-ковш 342 с.51.0000 (у=2,3 куб. м), инв. № 2506, 2014 г. в. | **34 725,00** | 1 736,25 | 3 472,50 |
| 21 | **Экскаватор ЕК-18-20**, инв. № 10124, рег. № ЕВ-3 4346 | **59 550,00** | 2 977,50 | 5 955,00 |
| 22 | **Кран козловой № 1**, инв. № 273, 1970 г. в. | **3 600,00** | 180,00 | 360,00 |

**Продавец:** ОАО «Гомельоблстрой», г. Гомель, ул. Малайчука,12. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.:** 8(029) 185-37-18 – управляющий в деле о банкротстве Колеснев Николай Михайлович; 8 (044) 700-40-60 – по спецтехнике и оборудованию Кучинский Владимир Александрович; 8 (044) 769-19-61, 8 (0232) 53-27-62 – по недвижимости Яроцкая Людмила Николаевна. **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона. Для участия в аукционе необходимо: 1**. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 6 февраля 2019 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 20 февраля 2019 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. **Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за 5 (пять) дней до его проведения.**

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником (претендентом на покупку), объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором торгов** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента его подписания и возместить затраты и расходы на организацию и проведение аукциона в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части) и с Законом РБ от 13.07.2012 № 415-З (ред. От 04.01.2014) «Об экономической несостоятельности (банкротстве)» ст. 127–129. **Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 14.11.2018 г. № 219 (28835). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы» и www.bankrot.gov.by. Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62**

Праекты і рашэнні

# ФАРНЫ, КАЛОЖА І ПАЛАЦ У СВЯЦКУ... З ГЛІНЫ

## У пасёлку Сапоцкін з'явіўся музей, дзе сабраны макеты вядомых архітэктурных помнікаў «бязвізавага рэгіёна»

**Экспазіцыя стане яшчэ адной адметнасцю ў турыстычным маршруце, які вядзе на Аўгустоўскі канал, лічаць арганізатары. Тут у адным месцы сабраны прататыпы амаль 20-ці славутасцяў Гродна і наваколля. Цікава, што стварылі макеты майстры-керамісты даволі хутка, усяго за два месяцы.**

А вось ідэя ўзнікла значна раней. Як расказала **начальнік аддзела культуры Гродзенскага райвыканкама Наталля РАМАНОВІЧ**, такая думка з'явілася пры наведванні калгаснай майстэрні керамістаў у аграгарадку Верцялішкі. Сярод работ убачыла некалькі храмаў. Вось тады і падумала: а чаму не зрабіць цэлую экспазіцыю славутых мясцін раёна?

Майстры прапанову падтрымалі і на аснове фотаздымкаў і віртуальных канструкцый узяліся за справу. Літаральна за два месяцы з'явілася сапраўдная экспазіцыя. Было вырашана, што размесціцца музей мініяцюр у культурна-турыстычным цэнтры гарадскога пасёлка Сапоцкін.

— Адрас невыпадковы. Праз Сапоцкін праходзіць адзін з самых папулярных турыстычных маршрутаў, які злучае Гродна і Аўгустоўскі канал, — расказвае Наталля Рамановіч. — Тут ёсць музей пісанкі, дзе можна прайсці майстар-клас па мясцовай тэхналогіі роспісу велікодных яек. Таму вырашылі акумуляваць матэрыяльную і нематэрыяльную спадчыну ў адным месцы. Дарэчы, усе храмы, якія прадстаўлены ў экспазіцыі, занесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў. Турысты, пабачыўшы іх у мініяцюры, магчыма, зацікавяцца і рэальнымі архітэктурнымі помнікамі з іх багатай гісторыяй.

Бадай, самым знакамітым у раёне можна назваць палацава-паркавы комплекс Свяцк. Будаваўся ён у XVIII стагоддзі па праекце італьянскага архітэктара Джузепе Сака для знакамітага роду Валовічаў. Але тым не пашчасціла тут пажыць. Існуе паданне, што дачка-шляхцянка пакахала мясцовага конюха, і бацька жорстка з імі расправіўся, загадаў пазбавіць абодвух жыцця. Кажуць, што постаць той дачкі доўгі час бачылі ў апусцелым палацы. Да вайны тут месцілася наркалагічная лячэбніца, у пасляваенны час — санаторый для хворых на сухоты. Некалькі гадоў таму тут пачалася маштабная рэканструкцыя, у выніку якой палац стане турыстычна-забаўляльным цэнтрам з гатэлем. Макет якраз і адлюстроўвае яго будучы выгляд.



Вельмі прыгожа выглядае шматкупальная царква, якая ў рэальнасці знаходзіцца ў вёсцы Мількаўшчына. Дарэчы, гэта вёска, у якой нарадзілася Эліза Ажэшка. Праўда, царква тут будавалася ў той час, калі пісьменніца жыла ў Гродне, гэта было ў 1904 годзе. А будаваў храм на ўласныя сродкі ўдзельнік руска-турэцкай вайны, генерал-лейтэнант Канстанцін Шырма. Займаючы пасаду начальніка Санкт-Пецярбургскага ваеннага гарнізона, ён узяў за аснову праект сваёй гарнізоннай царквы. Будавалі храм талакой. І скончылі даволі хутка — за два гады. Царкву не пашкодзілі дзве вайны, але яна пачала разбурацца, калі тут месціліся збожжасховішча і млын. Праўда, у 90-я гады мінулага стагоддзя мясцовыя майстры ўзнавілі святыню.

**Экскурсавод Анастасія БУГВІНА** можа расказаць шмат цікавага аб кожным гістарычным помніку, які прадстаўлены ў мініяцюры. Вось, напрыклад, царква Аляксандра Неўскага, што пабудавана ў Індуры ў другой палове XIX стагоддзя. Спачатку праект быў вельмі дарагі, і яго перадалі іншаму прыходу. А тут пабудавалі больш просты будынак, тым не менш у выніку атрымаўся арыгінальны пірамідальны сілуэт. Асаблівасцю царквы з'яўляецца вялікае мастацкае пано на сцяне на біблейскую тэму.



— Мы хочам не толькі пазнаёміць з аб'ектам, але і расказаць аб гэтай мясцовасці, дзе знаходзіцца славутасць. Напрыклад, у Адэльску ёсць не толькі помнік культавага дойлідства, але тут жыве вядомы майстар драўляных музычных інструментаў Мар'ян Скрамблевіч, творчасць якога ўваходзіць у спіс нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны. У спіс залічана і традыцыйная рэгіянальная кухня таго ж Адэльска. І такіх цікавых асаблівасцяў у раёне нямала, — адзначыла Анастасія Бугвіна.

Сярод макетаў прыцягвае ўвагу чырвоны касцёл, які знаходзіцца ў Скідзелі. Гэта былы прыдворны храм мясцовых князёў Чацвярцінскіх. Ён, дарэчы, і пабудаваны за іх кошт. Парадаксальна, але пасля вайны тут «кватэраваў» ваенкамат і адкрылі вадзіцельскія курсы. У канцы 90-х на ахвяраванні жыхароў зроблены касметычны рамонт. Аб'ект таксама ўнесены ў спіс гісторыка-культурнай спадчыны.

У макетах адлюстраваны і драўляныя храмы раёна, якія захаваліся ў вёсках Лаша, Прывалка і Парэчча. Усе яны выкананы ў кераміцы, але выглядаюць адпаведна са сваёй структурай.

У цэнтры экспазіцыі можна пазнаць славутасці Гродна — Фарны касцёл, Свята-Пакроўскі сабор, Каложу, пажарную каланчу. Адсюль пачынаецца турыстычны маршрут на канал. Дарэчы, на карце маршрута ёсць такія аб'екты, як доты і фарты. Вакол канала іх не адзін дзясятак. Макет дота таксама вырашылі ўключыць у экспазіцыю. Нядаўна ён стаў чарговым экспанатам музея.

— Мы будзем папаўняць экспазіцыю, — паведаміла Наталля Рамановіч. — У будучым тут з'явяцца страчаныя помнікі культуры рэгіёна. Напрыклад, у самім Сапоцкіне некалі былі ўніяцкая царква, сінагога, яны таксама будуць адлюстраваны ў макетах па старых фотаздымках. Хочам таксама прадставіць старажытнае яцвяжскае гарадзішча.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
**Фота Мікалая ЛАПІНА.**

Спытайце пра радзіннае

# Ці можна дарыць нож?

**Соф'я Парфір'еўна Н. з Мінска задала пытанне: «Маладым на вяселлі падарылі нажы. Жыццё ў сужэнцаў не склалася — пажылі толькі год. Старэйшыя людзі сказалі пасля, што дарыць нажы даволі кепская прыкмета. Нажы гэтыя ў яе захоўваюцца і цяпер. Што з імі рабіць?»**

У сакральнай мове абрадавых практык беларусаў нямала рэгламентацый звязана з існаваннем і выкарыстаннем побытавых рэчаў селяніна. Прычым часцей за ўсё яны маюць характар дакладна сфармуляванай забароны, сутнасць якой не падлягае абмеркаванню: так трэба — і ўсё тут! Напрыклад, не пазычай суседу нічога ў вялікае свята, асабліва солі і агню. Да гэтага шэрагу адносяцца шматлікія прадметы хатняга ўжытку і побытава-гаспадарчага карыстання, у тым ліку і нож.

Прадметы хатняга побыту і гаспадарчыя прылады працы ў народным ужытку дзяліліся на мужчынскія і жаночыя. Мужчынскі пачатак сімвалізавалі вострыя, калючыя, рэжучыя прадметы: сякера, нож, іголка, малаток, брусок, што касу менцяць, і іншыя. Шэраг рэчаў сімвалізаваў жаночы пачатак: дзяжа, даёнка, збан, міса, ложка, серп, падкова і іншыя. Даволі часта гэтыя рэчы ўтваралі сімвалічную «сямейную пару»: ключ і замок, прамы нож і закруглены серп, прамая іголка і загнутая шпілька, прамы крук і сагнутая завеса, дышаль і дуга, аглобля і хамут і г. д.

Магчыма, гэта функцыянальнае, семантычнае і знакавае размежаванне «парных» прадметаў хоць у нейкай ступені дапаможа зразумець прычыну таго, чаму нажы ніколі не былі прадметам, які дарылі родным і блізкім, а тым больш маладым на вяселлі.

Абрадавыя сітуацыі, у якіх нож з'яўляецца галоўным атрыбутам, даволі шматлікія і разнастайныя. Але шматпланавыя кантэксты зводзяцца да **дзвюх асноўных функцый — перасцерагаць, абараняць і дзяліць, адразаць, адлучаць, раз'ядноўваць.** Згадаем некалькі сітуацыйных прыкладаў.

Зусім нечакана нож аказаўся самым запатрабаваным прадметам на працягу першага года жыцця нованароджанага. Да часу хрэсьбін нож, які ляжаў пад посцілкай у калысцы, засцерагаў нехрышчонае дзіця, «каб яго не падмяніла нячыстая сіла». Калі ж па вёсцы неслі нябожчыка, маці клала нож у калысцы дзіцяці вастрыём да вуліцы. Каб па дарозе ў храм да дзіцяці не прычапіліся «прызоры», маці клала на парозе нож, а хросныя бацькі павінны былі пераступіць цераз яго. Калі ж немаўля пужалася, то яго «мералі» нажом, каб той «уцягнуў», гэта значыць забраў, у сябе спуд.

**Нож выконваў сваю галоўную ролю як прадмет, які дзяліў цэлае на часткі.** Гэта побытавая функцыя асэнсавана ў традыцыйнай культуры па-свойму і стала падставай для ўзнікнення пэўных абмежаванняў і патрабаванняў. Так, набываць нож павінен толькі гаспадар; відаць, таму лічылася, што і наразаць хлеб таксама павінен мужчына.

Функцыя дзяльбы, адлучэння, адмежавання, якая была замацавана за нажом, нарадзіла шэраг забарон, звязаных з паводзінамі людзей за сталом, які наадварот, з'яўляўся сімвалам аб'яднання, злучэння, збліжэння. Напрыклад, лічылася, што той, хто есць з нажа, будзе нястрыманым, злым, «вострым на язык», а таму ад яго адхінуцца людзі. Кожная выхаваная ў традыцыях гаспадыня ведала, што **нельга пакідаць нож на стале і асабліва ўтыркнутым у хлеб**, бо гэта прывядзе да таго, што дамачадцы будуць пастаянна сварыцца між сабой; менавіта таму забаранялася класці нож на стале паміж мужам і жонкай.

Для дапытлівых чытачоў нашых дыскурсаў звяртаем увагу, што **гаворка ідзе не пра сталовыя нажы, якія ідуць у пары з відэльцам, а пра той нож, якім «працуюць» на кухні, калі гатуюць ежу.**

Мудрая захавальніца народных традыцый Марыя Іванаўна Саланові з вёскі Любонічы Кіраўскага раёна расказвала: «Пасля вяселля праз дзён дзесяць я прыбегла дамоў і кажу маці: «Матулечка, я хачу вярнуцца дамоў!» Маці палажыла на стол непачаты бохан хлеба, адрэзала акраец і сказала: «Глядзі, дачушка, во, абратна не прыляпіш. Як гэты кавалак назад не прыклеіш, так і ты жыві з мужам, і да нас не вяртайся!»

Калі маладыя павінны сядзець на працягу вяселля за адным сталом, на адным кажусе, калі іх заводзілі за стол са звязанымі рукамі, то зразумела, што **падарыць ім нож магло азначаць толькі адно — жаданне, каб гэты сямейны саюз быў недаўгавечным.**

У беларусаў лічылі, калі дзяўчына падорыць свайму хлопцу сцізорык — іх вяселля не адбудзецца: з жаніхом здарыцца бяда. А сярод скандынаўскіх народаў да нашага часу бытуе павер'е: калі ў дзень вяселля нявеста дакранецца да нажа, яна можа застацца бяздзетнай. Параіць аўтару ліста можам наступнае: **падараваныя нажы неабходна выкінуць, а лепш за ўсё любым чынам знішчыць.**

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

Дасылайце свае пытанні аб каранях і прыстасаванасці да сучаснага жыцця каляндарных і сямейна-побытавых народных традыцый і абрадаў на паштовы або электронны адрас рэдакцыі з пазнакай «Пра радзіннае».

# «КОЖНЫ ВОСЬМЫ КАРАБЕЛЬ ПЛАВАЕ НА НАШЫХ ПРЫСАДКАХ»



Даследчая лабараторыя, у якой працуе лабарант Святлана КАПЛУНОВА, аснашчана самым сучасным абсталяваннем.

**Унікальнасцю многіх айчынных прадпрыемстваў зараз нікога не здзівіш. Але высокі прафесіяналізм гэтага калектыву не можа не радаваць. Карэспандэнты «Звязды» гутараць з генеральным дырэктарам СТАА «ЛЛК-Нафтан» Андрэем ЗВАНЦОВЫМ.**




### *Знаёмім з суразмоўнікам*

Нарадзіўся Андрэй Аляксандравіч у Полацку. З адзнакай скончыў Наваполацкі палітэхнікум, пазней завочна — Полацкі дзяржаўны універсітэт, а таксама Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Беларусі.

Працоўную біяграфію пачынаў на «Нафтане» аператарам у цэху па вытворчасці сульфанатных прысадак. Калі цэх перадаў свае функцыі «ЛЛК-Нафтану», працягваў займацца любімай справай тут. Прыступкі кар'ернай лесвіцы вялі толькі ўверх — інжынер-тэхнолаг у цэху, затым у аддзеле галоўнага тэхнолага і вытворча-дыспетчарскім падраздзяленні. Працаваў начальнікам сектара развіцця тэхналогіі, намеснікам начальніка і начальнікам аддзела інавацыйнага развіцця. З гэтай пасады, з улікам шматграннага досведу работы на стратэгічных кірунках, пасля пераезду папярэдняга кіраўніка Міхаіла Алегавіча Бабушкіна на работу ў Маскву быў прызначаны генеральным дырэктарам СТАА «ЛЛК-Нафтан».

Жанаты, бацька дзвюх дачок.

***— Андрэй Аляксандравіч, сёння ваша прадпрыемства па-ранейшаму адзін з самых буйных вытворцаў прысадак на тэрыторыі былога Саюза?***

— Так, на тэрыторыі СНД мы і самы буйны вытворца, і выпускаем найбольш шырокі спектр гэтай прадукцыі. Наша перавага ў тым, што вырабляем комплекс прысадак, у нашым пакеце да дзесяці відаў. Таму што іх функцыі адрозніваюцца — у маслах патрэбна нейтралізаваць прадукты згарання, змыць іх, зняць тэмпературу з паверхні поршняў, масла не павінна акісляцца ў працэсе эксплуатацыі і гэтак далей. Само масла павінна працаваць доўга, мець сур'ёзны рэсурс — гэтыя ўласцівасці якраз і забяспечвае комплекс прысадак.

***— Мяняецца клімат, і тэхніка рэагуе на гэта. Мяняюцца сама тэхніка, рухавікі. Ці мяняюцца прысадкі?***

— Мяняюцца, ва ўсім свеце. Калі параўнаць тэхналогіі вытворчасці 70-х гадоў і сучасныя, то бачна, што перамены адбыліся вельмі значныя. Умовы, у якіх зараз працуюць рухавікі, сталі больш жорсткія. Растуць хуткасці, нагрузкі на машыны, тэмпературы ў самім рухавіку. Значыць, іншая якасць патрабуецца і ад масла. І ўсе прысадачныя прадпрыемствы пастаянна займаюцца абнаўленнем сваіх тэхналогій. Тут нельга спыняцца.

На жаль, з распадам СССР айчынная прысадачная навука, што падтрымлівала прадпрыемствы, загінула: закрыўся спецыялізаваны УкрНДІ НП «МАСМА» ў Кіеве, закрыліся лабараторыі, што займаліся прысадкамі ў Інстытуце імя Губкіна і ў УНДІ ў Маскве.

Зразумела, што ў гэтых умовах няпроста на роўных канкураваць з сусветнымі прысадачнымі кампаніямі-монстрамі, якія маюць мільённыя бюджэты на навуку і старанна захоўваюць вынікі сваіх даследаванняў і ноу-хау, як гарантыю паспяховага існавання ў хісткай раўнавазе сусветнага бізнесу прысадак да змазачных маслаў. У гэтай няпростай сітуацыі мы імкнёмся ствараць умовы і выкарыстоўваць усе магчымасці для забеспячэння запатрабаванасці нашай прадукцыі.

Наша прадпрыемства, творча выкарыстоўваючы і ўдасканальваючы існуючыя, «абкатаныя» тэхналогіі, стварае новыя, шматабяцальныя кампазіцыі і пакеты прысадак, каб забяспечыць доўгатэрміновую перспектыву свайму прадукту. Маючы на ўвазе ўсю разнастайнасць рухавікоў для сучасных аўтамабіляў, скажам, што для кожнага з іх патрабуецца надзвычай якаснае масла, са сваімі ўласцівасцямі.

***— Але вы займаецеся і вытворчасцю прысадак для карабельных рухавікоў, у тым ліку і для так званых тронкавых матораў. Гэта адзін з вашых найбольш выгадных праектаў?***

— Распрацавалі такую прысадку сумесна з адной з даччыных фірмаў «Лукойла». Нармальна прайшлі выпрабаванні, праводзіліся яны ў рабочай абстаноўцы, на судне, у прысутнасці і з удзелам прадстаўнікоў нашай партнёрскай арганізацыі. Гэтая прысадка для суднавых маслаў стала эталонам, на які ўсе раўняюцца і якой спрабуюць капіраваць, што не так проста. Зараз па ліцэнзійным пагадненні мы прадаём яе «Лукойл Марын Лубрыканд», яны займаюцца суднавай тэмай. «Лукойл Марын» трымае 10 працэнтаў сусветнага рынку маслаў для суднаў.

І яшчэ адзін цікавы факт: кожнае восьмае судна ў свеце запраўлена маслямі з прымяненнем прысадак «ЛЛК-Нафтан».

Вы пытаецеся пра канкурэнцыю. Канкурэнцыя ёсць ва ўсім, у тым ліку і ў нашым сегменце рынку. Яна прымушае не стаяць на месцы, аналізаваць свой рынак. Даводзіцца пастаянна працаваць, каб суадносіны «якасць — цана» былі для шырокага спажыўца больш прымальнымі, чым у канкурэнтаў. І ў сваёй нішы адчуваем сябе дастаткова спакойна, павялічваем аб'ёмы вытворчасці. З кожным годам колькасць пакупнікоў расце, геаграфія продажу пашыраецца. Зараз пастаўляем прадукцыю больш чым у 40 краін свету.

***— Назавіце, калі ласка, лічбы, якія характарызуюць дынаміку вытворчасці.***

— У 2015 годзе мы выпусцілі 20 тысяч тон прадукцыі. Пастаўлена задача ў 2020 годзе выйсці на 40 тысяч. Мы кожны год рэалізуем шэраг інвестыцыйных праектаў, якія дазваляюць нам паступова нарошчваць магутнасці. Па меры таго, як уводзіліся новыя магутнасці, яны адразу загружаліся. Каб нарасціць «мускулы» амаль напалову, уводзілі новае больш прадукцыйнае абсталяванне, галоўным чынам расійскай вытворчасці, ці нямецкае, наогул еўрапейскае, вядомых вытворцаў — сепаратары, дэкантары... Павялічылі колькасць гэтых машын, бо бачылі, што ў перспектыве іх можа не хапіць.



Намеснік генеральнага дырэктара Леанід БУЛАЕЎ.



Вызначэннем аб'ёмнай часткі асадкаў заняты інжынер-тэхнолаг Дзмітрый ДАБРАВОЛЬСКІ.

Мы рухаліся як бы прыступкамі. Аптымізавалі тэхналагічныя працэсы. У прыватнасці, дабіліся, каб не было тэхналагічнага прастою. І паставілі перад сабой мэту далейшай аўтаматызацыі вытворчых працэсаў. Укараненне аўтаматызацыі становіцца адным з прыярытэтаў, і прысутнічае амаль ва ўсіх праектах.

***— А што ўвогуле прадугледжвае інвестыцыйны план?***

— Яго першы раздзел — інвестыцыі ў павышэнне прадукцыйнасці. Другі — у павышэнне якасці прадукцыі. Трэці раздзел — комплекс мер па прамысловай і экалагічнай бяспецы. Яшчэ і таму, што нарматыўныя патрабаванні становяцца больш жорсткімі. Каб не займацца пералікам, скажу, што інвестыцыйны план прадугледжвае комплексны падыход да рэалізацыі кожнага праекта, у тым ліку дастатковае фінансавае забеспячэнне.

***— І абнаўляцца вам даводзіцца ва ўмовах дзеючай вытворчасці...***

— У гэтым якраз і складанасць, асабліва калі ўлічыць, што працуем кругласутачна. Зноў жа дзейнічаем паэтапна, разлічваем кожны крок. Пад новае абсталяванне будаўнікі заліваюць фундаменты побач з дзеючым, таксама загадзя рыхтуюцца трубныя абвязкі, і калі наступае час уразацца ў вытворчы ланцужок, спыняем цэх на дзень-два. Звычайна гэтага хапае для перападключэння, бо падрадная арганізацыя прыводзіць на аб'ект дастатковыя сілы.

***— Адна з пастаянных тэндэнцый рынка — рост якасці. У вас на гэтым стратэгічным кірунку працуе тэхналагічная лабараторыя.***



Аператарная цэха № 3.

— Яна цудоўна аснашчана, што дазваляе сумесна з нашымі фундатарамі і пастаяннымі дзелавымі партнёрамі з LLK-International працаваць над удасканаленнем тэхналогій. Можна сказаць, што наша лабараторыя мае ўсё для таго, каб кампенсаваць прадпрыемству функцыі былой галіновай прысадачнай навукі. Прыцягваем і старонніх навукоўцаў, і спецыялістаў, часцей расіян.

Спецыялісты лабараторыі таксама ажыццяўляюць строгі ўваходны кантроль сыравіны і паэтапны кантроль вытворчага працэсу. У выніку маем сертыфікаты на сістэму кіравання якасцю, на кіраванне навакольным асяроддзем — сучасныя, абноўленыя версіі. І на ўсю прадукцыю, на ўсе яе віды.

## У ЧЫМ СУТНАСЦЬ БІЗНЕСУ

Экспрэс-інтэрв'ю з **Леанідам БУЛАЕВЫМ**, намеснікам генеральнага дырэктара.

***— Вы адказваеце за вытворчасць. Што самае складанае ў вытворчасці?***

— Тэхналогія. Гэта глыбокая навука. Захаванне тэхналогіі важней за ўсё. А затым — людзі. Калі пачыналі з імі працаваць, было няпроста. А калі яны зразумелі, што ад іх патрабуецца і як яны павінны працаваць, тады ўсё стала на сваё месца. Сёння ў нас калектыў, з якім прыемна мець справу.



Старшы аператар Віктар ГОВАРАЎ — спецыяліст з вялікім вопытам.

У сваёй рабоце абапіраюся на начальнікаў цэхаў. Ды і на аператараў таксама, бо гэта дасведчаныя людзі. У іх ёсць тэхналагічная карта, у якой закладзены параметры працэсу, і на экране камп'ютара аператар бачыць, наколькі дакладна яны выконваюцца.

***— А што самае радаснае для вас?***

— Калі пачынаеш нейкую новую справу, і яна атрымліваецца. Мяне асабіста зараз больш за ўсё радуе, што мы ў сваёй рабоце па паказчыках якасці прадукцыі ўшчыльную наблізіліся да ўзроўню эталонных, скажам так, фірмаў-гігантаў, якія даўно і ўстойліва дыктуюць надвор'е на знешніх рынках. Такіх як амерыканскі Lubrizol, напрыклад.

### МОВАЙ ЛІЧБАЎ

Летась выраблена і прададзена прыкладна 33 тысячы тон прадукцыі, што на 17 % больш за ўзровень 2017 года.

На рэалізацыю інвестыцыйных праграм у 2018 годзе было накіравана прыкладна тры мільёны долараў.

Прыбытак атрыманы на тры працэнты большы, чым за папярэдні перыяд.

Тэхналогіі не мяняюцца, а ўдасканальваюцца, — працягвае Леанід Мікалаевіч. — Агульная тэхналогія застаецца, і ўся справа ў наватарскім, творчым падборы інгрэдыентаў, якія прыдадуць прадукту патрэбныя ўласцівасці. Арыгінальную тэхналогію не купіш, яе патрэбна «выпакутаваць». Так што сутнасць бізнесу нашага калектыву — пастаяннае развіццё.

...Перад Новым годам кіраўнік урада ўручыў Леаніду Булаеву медаль «За працоўныя заслугі». Развітваючыся, мы пажадалі Леаніду Мікалаевічу, каб узнагарода была не апошняй.

***Ад рэдакцыі. Выказваем шчырую падзяку памочніку генеральнага дырэктара Іне Герасімаўне Памінавай за разнабаковую дапамогу ў падрыхтоўцы публікацыі.***

**Публікацыю падрыхтавалі Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ і Яўген ПЯСЕЦКІ (фота).**

УНП 390401182



Высокую якасць прадукцыі забяспечваюць кваліфікаваныя спецыялісты, сярод якіх аператар Аляксандр АРЛОЎ.

### *Перадавікі і наватары вытворчасці*

Л. М. Булаеў, намеснік генеральнага дырэктара па вытворчых і тэхнічных пытаннях;
В. Н. Краўчанка, аператар цэха № 3;
Н. П. Шыпіла, аператар цэха № 2;
В. Б. Зяленскі, аператар цэха № 2;
А. А. Ярашэнка, інжынер-тэхнолаг;
В. М. Якубяк, вядучы інжынер па новых тэхналогіях;
К. П. Антух, інжынер-тэхнолаг;
А. Т. Пылькіна, аператар ТСУ;
В. Е. Гавяза, старшы аператар цэха № 2;
А. В. Янтурын, прыбарыст службы КВПіА;
П. Ю. Корбут, начальнік ЭЭУ;
С. В. Каралёва, вядучы бухгалтар;
В. В. Мацюшонак, інжынер-праграміст;
А. Л. Коршун, намеснік начальніка вытворчасці;
А. Д. Зязюля, трактарыст.

**У дырэкцыі прадпрыемства зазначылі: гэты спіс можна працягваць. Што мы наступным разам і зробім.**

# ЛЕТАПІС АДНОЙ ВЁСКІ



Вёска Замошша з вышыні птушынага палёту.

*(Працяг. Пачатак на 1-й стар.)*

У Чашніцкім раёне два паселішчы з адной назвай — Замошша — і абодва яны (сапраўднае супадзенне) знаходзяцца на памежжы з Лепельскім раёнам. Таму іх часта блытаюць. Пра Замошша, якое суседнічае з Бярэзінскім біясферным запаведнікам і ўваходзіць у Красналуцкі сельскі Савет, гаворыцца ў новай кнізе. Ведаючы, што вёска ўжо больш ніколі не зазнае былога росквіту (у свой час Замошша было цэнтрам сельскага Савета і калгаса), цяперашнія і былыя жыхары з пачуццём настальгіі і гонару задумалі стварыць мемарыяльны летапіс. Фактычна яны стварылі помнік сваёй малой радзіме! Не чакаючы ад дзяржавы дапамогі, самі знайшлі сродкі, даслалі ўспаміны, падзяліліся сямейнымі фатаграфіямі. У гэтым ім дапамог краязнавец з суседняй вёскі настаўнік гісторыі Велеўшчынскай школы Валерый Тухта. Шмат свайго вольнага часу Валерый прысвяціў вывучэнню архіўных крыніц, ён даследаваў замашанскія наваколлі, запытваў старэйшых вяскоўцаў, скрупулёзна падбіраў дакументы. Краязнаўцу дапамагала апантаная высакароднай ідэяй пенсіянерка Антаніна Стэльмах. У яе доме і прайшла незабыўная прэзентацыя, якая хутчэй нагадвала радасную і шчымлівую сустрэчу землякоў пасля доўгай разлукі. У заснежанае Замошша прыехала з паўсотні чалавек — з Мінска, Полацка і Наваполацка, Барысава і Новалукомля, з Чашнікаў і Лепеля. З Расон прыехала старэйшая з замашанцаў — былая настаўніца дзевяностагадовая Марыя Стэльмах. Многія падзяліліся шчырымі ўспамінамі пра маладыя гады, успомнілі свае радаводы. Кожны з іх атрымаў запаветны асобнік. Былі тут прадстаўнікі сем'яў Каралёвых, Хвясько, Бязрукіх, Бабаедаў, Мінтузаў, Крывалапаў, Кандыбайлаў, Кульгацкіх, Левашкевічаў, Юхневічаў, Вашкевічаў, Галоўкаў, Аноўкаў, Вогураў, Давыдавых, Шунтоў, Скорбаў, Пшонак, Галубцоў, Шалакоў, Целашоў і Казакоў, Карабаняў і Гардзіёнкаў, Дзямкоў і Маліноўскіх, Босых і Стэльмахаў. Усе яны ўвекавечаны ў замашанскай аўтабіяграфіі.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

*Больш здымкаў глядзіце на сайце zviazda.by.*

Марыя Рыгораўна *(злева)* і Антаніна Аляксандраўна СТЭЛЬМАХ.





Аўтар кнігі гісторык Валерый ТУХТА.




Разварот кнігі з фотаздымкамі.

*Скарыстайцеся вашым смартфонам, каб адсканаваць QR-код і ўбачыць больш фота.*

Тамара ДАРОШКА з унучкай Лізаветай і Кацярына КАНДЫБАЙЛА ў час прэзентацыі кнігі.



Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

**Извещение о проведении повторного аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | Гродненское областное потребительское общество, Гродненская обл., г. Гродно, ул. 1 Мая, 28 (Сморгонский филиал, Гродненская обл., г. Сморгонь, ул. Чапаева, 3) |

**Предмет аукциона**

**Здание магазина** (общ. пл. 77,9 кв. м, 443/С-21062, составные части: блочный сарай). Адрес: **Гродненская обл., Сморгонский р-н, Кореневский с/с, д. Лубянка, 1Б**

**Сведения о земельном участке**: пл. **0,0473** га предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для размещения объектов розничной торговли с установленными ограничениями (водоохранная зона водных объектов)

**Начальная цена лота с НДС 20 % – 3 210,00 бел. руб.** (снижена на 70 %)

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15** рабочих дней после проведения аукциона |

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, условия оплаты предмета аукциона, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 09.01.2019

**Аукцион состоится 20.02.2019** в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и **необходимые документы принимаются по 18.02.2019** до 17.00 по указанному адресу. Тел.: +375 17 280-36-37; 8 029 317-95-42. www.cpo.by. **E-mail: auction@cpo.by**

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении аукциона

Управляющий в производстве по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) ОАО «Агрокомбинат «Олехновичи» проводит открытый аукцион по продаже имущества:

**Лот № 1**

| **Недвижимое имущество** | | | |
|---|---|---|---|
| **№** | **Наименование** | **Інв. №** | **Общ. пл., кв. м** |
| 1 | здание конторы (административное здание) | 630/С-60033 | 1557,7 |
| 2 | здание проходной № 1 | 630/С-73099 | 56 |
| 3 | здание склада № 3 | 630/С-73101 | 16,7 |
| 4 | здание дезбарьера | 630/С-73106 | 51,6 |
| 5 | здание весовой | 630/С-73100 | 133,2 |
| 6 | автогараж | 630/С-64351 | 736,6 |
| 7 | здание диспетчерской | 630/С-73110 | 22,7 |
| 8 | здание склада | 630/С-73105 | 71,8 |
| 9 | здание проходной № 2 | 630/С-73140 | 6,3 |
| 10 | здание склада | 630/С-73103 | 1136,9 |
| 11 | здание склада | 630/С-73102 | 22,3 |
| 12 | мастерские механические | 630/С-64360 | 788,1 |
| 13 | здание колбасного цеха | 630/С-60036 | 902,1 |
| 14 | консервный цех | 630/С-64361 | 257,1 |
| 15 | здание котельной | 630/С-60028 | 890,7 |
| 16 | убойный цех | 630/С-64347 | 2137,9 |
| 17 | здание лаборатории | 630/С-73223 | 286,2 |
| 18 | здание скотобойной площадки | 630/С-73224 | 283 |
| 19 | здание склада для хранения тары | 630/С-73227 | 579 |
| 20 | здание склада | 630/С-73228 | 65 |
| 21 | здание склада | 630/С-73230 | 65,6 |
| 22 | здание склада | 630/С-73231 | 65 |
| 23 | здание склада | 630/С-73435 | 63,9 |
| 24 | здание склада | 630/С-73232 | 64,4 |
| 25 | здание склада | 630/С-73233 | 64,7 |
| 26 | здание ветблока | 630/С-73225 | 503,7 |
| 27 | склад для хранения комбикорма | 630/С-64346 | 865,3 |
| 28 | здание инкубационного цеха | 630/С-73107 | 1002,3 |
| 29 | птичник-маточник № 1 | 630/С-64359 | 1363,4 |
| 30 | здание маточника птичника № 2 | 630/С-73408 | 1364 |
| 31 | здание маточника птичника № 5 | 630/С-73410 | 1386,4 |
| 32 | здание маточника птичника № 4 | 630/С-73409 | 906,3 |
| 33 | здание маточника птичника № 6 | 630/С-73411 | 1359,8 |
| 34 | здание маточника птичника № 7 | 630/С-73412 | 1375,9 |
| 35 | здание птичника № 17(2) | 630/С-42687 | 1093 |
| 36 | здание птичника № 8 | 630/С-47495 | 1372,4 |
| 37 | здание птичника № 24 | 630/С-60035 | 1440,2 |
| 38 | здание птичника № 23 | 630/С-73407 | 1390,6 |
| 39 | здание птичника № 22 | 630/С-73406 | 1382,1 |
| 40 | здание птичника № 21 | 630/С-73405 | 1387,2 |
| 41 | здание птичника № 20 | 630/С-73404 | 1392,1 |
| 42 | здание птичника № 19 | 630/С-73403 | 1391,4 |
| 43 | здание птичник № 18 | 630/С-73401 | 1390,8 |
| 44 | здание батарейного цеха № 1 | 630/С-47499 | 1802,8 |
| 45 | здание батарейного цеха № 2 | 630/С-47492 | 1804,4 |
| 46 | здание батарейного цеха № 3 | 630/С-47502 | 1793,3 |
| 47 | здание птичника № 17(1) | 630/С-42686 | 1096,7 |
| 48 | здание птичника № 16 | 630/С-42685 | 1099,9 |
| 49 | здание птичника № 15 | 630/С-42683 | 1097,2 |
| 50 | здание птичника № 14 | 630/С-73400 | 1383,7 |
| 51 | птичник № 13 | 630/С-64355 | 1385,2 |
| 52 | птичник № 12 | 630/С-60032 | 1391,7 |
| 53 | птичник № 11 | 630/С-64350 | 1378,5 |
| 54 | здание птичника № 10 | 630/С-60031 | 1431,8 |
| 55 | птичник № 9 | 630/С-64349 | 1421.1 |
| 56 | здание батарейного цеха № 4 | 630/С-64356 | 1799,4 |
| 57 | здание батарейного цеха № 5/1,2 | 630/С-64352 | 1798,1 |
| 58 | здание батарейного цеха № 6/1,2 | 630/С-64354 | 1816,2 |
| 59 | здание конюшни | 630/С-73413 | 294,7 |
| **Сооружения** | | | |
| № | Наименование | Инв. № | Протяженность / общ. пл. |
| 60 | линия освещения | 630/С-73970 | 1778,9 м |
| 61 | сети электрические | 630/С-73972 | 6946,5 м |
| 62 | сети водоснабжения | 630/С-73973 | 5041,8 м |
| 63 | автомобильные дороги внутреннего и наружного использования | 630/С-73975 | 59453,7 кв. м |
| 64 | ливневая канализация | 630/С-74625 | 3249,8 м |
| 65 | сети газоснабжения и газораспределения | 630/с-77315 | 7783,4 м |
| Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 623800000001000019 общей площадью 88,8596 га (предоставлен на праве постоянного пользования) по адресу: Минская область, Молодечненский район, Олехновичский с/с, 43. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав: земли, находящиеся в охранных зонах магистральных трубопроводов, систем газоснабжения, код – 7, площадь – 0,24 га; земли, находящиеся в прибрежных полосах водных объектов, код – 1, площадь – 6,93 га; земли, находящиеся в охранных зонах линий электропередачи, код – 6, площадь – 4,98 га | | | |
| 66 | пометохранилище | 630/С-73924 | 4466,0 кв. м |
| Объект расположен на земельном участке с кадастровым номером 623800000001000018 общей площадью 58,6567 га (предоставлен на праве постоянного пользования) по адресу: Минская область, Молодечненский район. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав: земли, находящиеся в охранных зонах линий электропередачи, код – 6, площадь- 0,58 га; земли, находящиеся в охранных зонах линий электропередачи, код – 6, площадь – 0,68 га | | | |
